

ХУТКА Ў МІНСКУ – «ТЭАРТ»! **7**

ПАБЫВАЛІ Ў МУЗЕІ ГРОШАЙ... **11**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЖНІЎНЯ 2018 г. СУБОТА № 163 (28779)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*«Дзякуючы прыёмам грамадзян мы робім раскладку, дзе вызначаем балючыя пытанні, глядзім, куды накіраваць рэсурсы, каб максімальна задаволіць патрэбы людзей. Тэматыка зваротаў застаецца нязменнай: людзей хвалююць асабістыя праблемы, грамадскія — звязаныя з добраўпарадкаваннем участка або пасёлка. Прычым частку з іх удаецца ўрэгуляваць яшчэ да прыезду губернатара. Тыя пытанні, якія можна зняць на мясцовым узроўні, раённыя ўлады вырашаюць. Тыя, якія ім зняць не ўдалося, абмяркоўваем разам: запрашаем спецыялістаў або даём даручэнні, каб разабрацца і даць чалавеку правільны і кампетэнтны адказ».*

# КАРАВАЙ ДЛЯ ХЛЕБАРОБА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Гаспадыня Бацвінаўскага музея хлеба, што ў Чачэрскім раёне, Ірына НІКІШОВА спякла духмяны каравай па адмысловым рэцэпце, які дастаўся ад матулі, і асабіста ўручыла яго Фёдару ХАЛЬЦОВУ — найлепшаму кіроўцу гаспадаркі ААТ «Бацвінава» на жніве. Фёдар Віктаравіч кожны год дэманструе высокі тэмп і якасць перавозкі хлеба з палёў. Сёлета ён зноў стаў адным з найлепшых: перавёз на сваім МАЗе больш за тысячу тон збожжа.**

## КОРАТКА

• Салігорск адзначае 60-годдзе. З юбілеем жыхароў і гасцей горада павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і пажадаў усім моцнага здароўя, шчасця і міру.

• **На «Беларуськаліі» дадзены старт будаўніцтву завода па вытворчасці нітрату калію.**

• У РНПЦ «Маці і дзіця» паспяхова аказалі меддапамогу нованароджанаму з экстрэмальна нізкай масай цела. Малы нарадзіўся на 25-м тыдні. Ён важыў пры нараджэнні 640 грамаў. Зараз пагрозы для жыцця хлопчыка няма.

• **Жыхар Гродна вырасціў на прысядзібным участку гіганцкі гарбуз. Зараз гарбуз дасягае 375 сантыметраў у акружнасці, але яшчэ працягвае расці.**



ISSN 1990 - 763X

■ Напярэдадні

## У ПРАДЧУВАННІ СВЯТА

XXV ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

**Насельніцтва брэсцкага райцэнтра Іванава на сёння складае 16 тысяч чалавек. Але ў першыя выхадныя верасня яно дакладна прырасце яшчэ на некалькі тысяч — дзякуючы шматлікім гасцям з Мінска і абласцей, а таксама замежных дэлегацый з Расіі, Латвіі, Малдовы, Таджыкістана, Венгрыі, Палесціны, Японіі ды іншых краін свету, якія прымуць удзел у святкаванні юбілейнага 25-га Дня беларускага пісьменства.**

Як адзначае **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Беларусі Алена ПАЎЛАВА**, айчынным кнігавыдаўцам ёсць што паказаць на Дні пісьменства. Толькі за шэсць месяцаў гэтага года ў нашай краіне было выдадзена 4679 найменняў кніг (у тым ліку 643 найменні — на беларускай мове) агульным тыражом звыш 11,7 мільёна асобнікаў.

У праграме Фестывалю кнігі і мастацтва, якія па традыцыі ладзіць міністэрства ў межах Дня пісьменства, сёлета ўпершыню будзе асобна прадстаўлена праваслаўная кніга, а ў некаторых мерапрыемствах, як чакаецца, возьме ўдзел Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

На міжнародным круглым стале беларускіх і замежных літаратараў абмяркуюць перспектывы культурнага супрацоўніцтва праз літаратуру каля 40 паэтаў і пісьменнікаў з не менш як 13 краін свету, прычым Кыргызстан і Эквадор будуць прадстаўленыя ўпершыню.

СТАР. 6

■ Хутка ў школу

## КАБ НЕ СТАЯЦЬ У ЧАРЗЕ Ў ПАЛІКЛІНІЦЫ...

### Пра даведку для вучня паклапаціцеся загадзя

**Канец лета — гарачая пара не толькі ў аддзелах школьнага адзення і канцтавараў. Пасля летняга зацішша ажылі ў гэтыя дні і дзіцячыя паліклінікі — такое паняцце, як дыспансерызацыя, актуальнае і для школьнікаў. Больш за тое, калі некаторыя дарослыя могуць яго ігнараваць, пазбягаючы візіту да ўрачоў, то ў дзяцей зрабіць гэта ніяк не атрымаецца: і ў дзіцячых садках, і ў школах патрабуюць даведкі аб стане здароўя, атрымаць якія можна толькі прайшоўшы пільны медагляд. Як праходзіць дыспансерызацыя ў канцы жніўня, карэспандэнт «Звязды» паназірала, завітаўшы з дачкой у 3-ю дзіцячую клінічную паліклініку Мінска.**

Яшчэ ў пачатку ліпеня на хатні тэлефон нам патэлефанавала ўчастковая медсястра і нагадала, што паколькі дзень нараджэння ў дачкі ў жніўні, то пажадана на працягу найбліжэйшага месяца наведаць урачоў і здаць аналізы. І запрасіла на прыём да педыятра, які і накіруе да патрэбных спецыялістаў. Крыху здзівіўшыся такому сэрвісу, да педыятра мы завіталі. Урач, уважліва вывучыўшы анамнез 13-гадовай дзяўчынкі, выдала так званы індывідуальны план дыспансерызацыі. У ім — звыклыя працэдуры, якія трэба праходзіць, каб атрымаць даведку для школы: скрынінгавы кабінет, стаматолаг, электракардыяграма сэрца, здача агульных аналізаў крыві (у тым ліку на цукар) і мачы. Паколькі акулiста сёлетняй вясной мы ўжо наведвалі, ніякіх дадатковых спецыялістаў нам праходзіць не трэба. Дарэчы, для тых, хто праходзіць медагляд, урачы спецыялізаваных службаў, а менавіта: неўролаг, афтальмолаг, хірург і оталарынголаг (калі іх наведванне ўрач-педыятр палічыць неабходным) — працуюць у асобна выдзеленыя гадзіны, каб здаровыя дзеці не кантактавалі з хворымі.

СТАР. 10

■ Знешняя палітыка

# З ДАДАТКОВЫМ СТАТУСАМ

## Назначаны новы пасол Расіі ў Беларусі



**Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін назначыў Міхаіла Бабіча, які ранней займаў пасаду паўнамоцнага прадстаўніка Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў Прыволжскай федэральнай акрузе, Надзвычайным і Паўнамоцным Пaслом Расіі ў Беларусі. Іншым указам расійскі Прэзідэнт назначыў Міхаіла Бабіча спецпрадстаўніком Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю.**

Учора Уладзімір Пуцін правёў рабочую сустрэчу з Міхаілам Бабічам ужо ў новай якасці, паведамляе афіцыйны сайт расійскага лідара. Уладзімір Пуцін падкрэсліў важнасць узаемадзеяння з галоўным саюзнікам, партнёрам Расіі.

Новы пасол Расіі ў Беларусі выказаў намер разам з урадам сваёй краіны, Адміністрацыяй Прэзідэнта і беларускімі партнёрамі зрабіць усё, каб дамоўленасці паміж кіраўнікамі дзяржаў былі рэалізаваны на практыцы. Паўнамоцтвы спецыяльнага прадстаўніка Прэзідэнта Расіі дазволяць павысіць эфектыўнасць гэтай работы, запэўніў Міхаіл Бабіч.

Міністэрства замежных спраў Беларусі пракаментавала прызначэнне ў краіну новага расійскага пасла з наданнем яму статусу спецпрадстаўніка Прэзідэнта Расіі.

«Адбываецца ратацыя паслоў, для дыпламатычнай службы гэта нармальны працэс. Пры гэтым перш за ўсё хацелі б падзякаваць паслу Расіі Аляксандру Сурыкаву, які сыходзіць, за яго шматгадовую шчырую працу і важкі ўнёсак у развіццё нашых адносін, — адказаў на адпаведнае пытанне карэспандэнта БелТА **начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль ГЛАЗ.** — Мы звярнулі ўвагу на тое, што новы пасол Расіі ў Беларусі надзяляецца статусам спецпрадстаўніка па развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі. Гэта чарговы раз сведчыць пра асаблівы характар, сур'ёзны маштаб і высокі ўзровень беларуска-расійскага супрацоўніцтва».

Прадстаўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства выказаў надзею, што асаблівы статус дазволіць новаму кіраўніку расійскай дыпламатычнай місіі больш эфектыўна і аператыўна рашаць комплекс пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай сферы, што вельмі важна для абедзвюх краін.

Дарэчы, напярэдадні з Надзвычайным і Паўнамоцным Пaслом Расійскай Федэрацыі Аляксандрам Сурыкавым сустрэўся прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас. На сустрэчы былі абмеркаваны актуальныя пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў розных сферах.

У той жа дзень міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў сустрэўся з Ігарам Петрышэнкам з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў Маскве ў сувязі з назначэннем на пасаду намесніка прэм'ер-міністра Беларусі. Пра гэта паведамляе сайт беларускай дыпмісіі. У ходзе гутаркі таксама былі абмеркаваны актуальныя пытанні развіцця расійска-беларускіх адносін, у тым ліку ў Саюзнай дзяржаве, а таксама будучыя кантакты і мерапрыемствы. Выказана ўзаемная зацікаўленасць у далейшым пашырэнні палітычнага, гандлёва-эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, цеснага і давернага дыялогу паміж знешнепалітычнымі ведамствамі дзвюх краін.

Сяргей Лаўроў падзякаваў Ігару Петрышэнку за канструктыўны ўклад ва ўмацаванне двухбаковай інтэграцыі і пажадаў яму поспехаў на новай адказнай пасадзе.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Фінансы

# Дапоўненая крэдытная гісторыя

**У сілу ўступіў закон, які дазволіць банкам атрымліваць больш дакладную інфармацыю пра патэнцыйнага атрымальніка крэдыту.**

Пра гэта паведамляе сайт Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Цяпер крыніцы фарміравання крэдытных гісторый павялічацца за кошт лізінгавых арганізацый і Банка развіцця Рэспублікі Беларусь. У склад крэдытных гісторый будуць уключаны звесткі аб дагаворах лізінгу, факторынгу і ўступкі грашовага патрабавання пры ажыццяўленні факторынгавай аперацыі. Факторынг — гэта комплекс паслуг, пры якіх дэбіторскі доўг спажыўца тавару або паслугі ўступаецца (прадаецца) трэцяму боку (банку або спецыялізаванай кампаніі).

Закон пашырае пералік звестак аб крэдытных здзелках у складзе крэдытных гісторый. У прыватнасці, звесткі аб крэдытных дагаворах з аднаўляльнымі крэдытнымі лініямі і дагаворах, якія змяншаючаць умовы авердрафтнага крэдытавання, дапаўняюцца інфармацыяй пра суму тэрміновай запазычанасці, тэрмін аднаўляльнасці крэдыту, дату ўстанаўлення ліміту авердрафту.

Таксама законам устаноўлена сувязь дагавораў забеспячэння (паручыцельства, гарантыя) з выдадзеным пад гэта забеспячэнне крэдытам, што дазволіць ацэньваць фактычную суму астатку асноўнага доўгу.

Акрамя таго, прадугледжана магчымасць атрымання згоды суб'екта крэдытнай гісторыі на даванне крэдытнай справаздачы ў электронным выглядзе без выкарыстання электроннага лічбавага подпісу.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кітай заклікаў ЗША «прыцішыць вялікадзяржаўны гегеманізм»



Кітай заклікае Вашынгтон паважаць правы іншых краін вызначаць сваю палітыку і прыцішыць вялікадзяржаўны гегеманізм, заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС КНР Лу Кан, каментуючы заявы Белага дома аб тым, што рашэнне ўрада Сальвадора аб усталяванні дыпламатычных адносін з Кітаем пагражае эканамічнаму стану і бяспецы ўсяго амерыканскага кантынента. «Сальвадор устанавіў дыпламатычныя адносіны з КНР на аснове прынцыпу аднаго Кітая. Гэта адпавядае асноўным нормам міжнароднага права і міжнародных адносін, а таксама карэнным інтарэсам народаў дзвюх краін. Кітайскі бок заклікае некаторыя краіны паважаць правы іншых краін вызначаць сваю ўнутраную і знешнюю палітыку і спыніць свой вялікадзяржаўны гегеманізм», — заявіў на брыфінгу Лу Кан. Ён нагадаў, што да 21 жніўня ў Кітая былі ўсталяваны дыпламатычныя адносіны з 25 дзяржавамі на абодвух амерыканскіх кантынентах, у тым ліку і з ЗША.

### Скота Морысана абралі новым прэм'ерам Аўстраліі

Новым лідарам кіруючай Ліберальнай партыі Аўстраліі і прэм'ер-міністрам краіны абраны скарбнік урада Скот Морысан, паведамляе тэлеканал ABC. Выбары новага партыйнага лідара прайшлі на сходзе парламенцкай фракцыі лібералаў. Экс-прэм'ер Малькальм Тэрнбул напярэдадні заявіў, што сыдзе з палітыкі, калі яго калегі арганізуюць галасаванне па пытанні пра кіраўніка партыі. На яго замену акрамя Морысана прэтэндавалі былы кіраўнік МУС Пітэр Датан і міністр замежных спраў Джулі Бішап, якая выбыла ў першым туры галасавання. У другім туры Морысан атрымаў перамогу, набраўшы 45 галасоў супраць 40 у свайго саперніка.

### Міжнародныя рэзервы Расіі зменшыліся за тыдзень на $5,4 млрд



Міжнародныя рэзервы склалі $452,2 млрд, скараціўшыся за тыдзень на $5,4 млрд, або на 1,2 % пад уздзеяннем адмоўнай пераацэнкі, паведаміў Банк Расіі. Апошні раз на такім узроўні рэзервы ЦБ знаходзіліся 26 студзеня гэтага года. Варта таксама адзначыць, што яны скарачаюцца ўжо чатыры тыдні запар. Пры гэтым сёлета ў красавіку, калі прайшоў першы цыкл дэвальвацыі рубля ў гэтым годзе з-за ўвядзення санкцый супраць Алега Дзерыпаскі і Віктара Вексельберга, рэзервы не скарачаліся. Аналітыкі тлумачаць такую сітуацыю шмат у чым тым, што таннее золата. ЦБ пачаў рэзка мяняць структуру рэзерваў — скарачаць укладанні ў амерыканскія казначэйскія аблігацыі і яшчэ мацней нарошчваць долю золата. Так, у ліпені ЦБ закупіў 26,1 тоны гэтага каштоўнага металу — рэкордны аб'ём за апошнія дзевяць месяцаў. Агульныя запасы выраслі да 2170 тон, тады як у пачатку года яны складалі каля 1900 тон.

# АПТЭКАМ ПАКАЖУЦЬ МЕРУ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 345 «Аб рэгістрацыі цэн на лекавыя сродкі», якім устаноўлены патрабаванні да абавязковай рэгістрацыі гранічных адпускных цэн вытворцамі лекаў для лячэння сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў.**

Дакумент накіраваны на больш эфектыўны кантроль за фарміраваннем цэн на лекі на ўнутраным рынку краіны, а таксама забеспячэнне супастаўнага з сумежнымі дзяржавамі ўзроўню цэн на імпартныя лекавыя прэпараты аднаго гандлёвага найменння, паведамляе афіцыйны інтэрнэт-партал кіраўніка дзяржавы.

Палажэнні ўказа распаўсюджваюцца на 37 міжнародных непатэнтаваных найменняў лекавых сродкаў пры іх абароце на тэрыторыі краіны. Замежным і айчынным вытворцам неабходна будзе зарэгістраваць гранічныя адпускныя цэны на названыя лекавыя сродкі да 1 студзеня 2019 года, удакладняе сайт Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) Рэспублікі Беларусь. Таксама з 1 студзеня 2019 года па 31 снежня 2020 года згодна з дадаткам да ўказа забараняецца рэалізацыя на тэрыторыі Беларусі лекавых сродкаў, гранічныя адпускныя цэны на якія не зарэгістраваныя. Дзейнічаць указ будзе на працягу 2018—2020 гадоў.

Парадак рэгістрацыі цэн, а таксама парадак вядзення рэестра гранічных адпускных цэн будзе зацверджаны пастановай урада, а методыка разліку гранічных адпускных цэн — сумеснай пастановай МАРГ і Міністэрства аховы здароўя.

Для праверкі паўнаты пададзеных звестак дакументы неабходна будзе адпраўляць у Цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя, пасля чаго яны будуць накіроўвацца ў МАРГ. У цэлым працэдура рэгістрацыі гранічных адпускных цэн зойме не больш за 30 працоўных дзён, запэўніваюць у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Рэалізацыя ўказа дазволіць выключыць магчымасць продажу лекаў па неабгрунтавана высокіх цэнах, а таксама прааналізаваць мэтазгоднасць яго распаўсюджвання на іншыя групы лекавых сродкаў.

# Што хвалюе мэра сталіцы?

**«Аб'яднанне ў горадзе камбінатаў школьнага харчавання ў адзіную структуру дазволіць больш якасна забяспечыць арганізацыю харчавання выхаванцаў устаноў адукацыі», — такую думку выказаў падчас жнівеньскага форуму педагагічных работнікаў сталіцы старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ.**

Нагадаем, што сёння харчаванне школьнікаў у Мінску арганізуюць дзевяць камбінатаў школьнага харчавання, і ў гэтай сістэме задзейнічана больш як дзве тысячы чалавек.

— Арганізацыя харчавання — першае, што мяне хвалюе як кіраўніка горада, — падкрэсліў Андрэй Шорац. — І я лічу, што ад гэтага працэсу не павінны дыстанцыравацца кіраўнікі ўстаноў адукацыі, бо ўсе негатыўныя факты, якія ўскрываюцца кантрольнымі і праваахоўнымі органамі, сталі магчымыя ў тым ліку з маўклівай згоды адміністрацыі нашых устаноў адукацыі. Вы павінны займаць больш прынцыповую пазіцыю і ўказваць калегам, камбінатам школьнага харчавання на тыя праблемы і недапрацоўкі, якія ўсё яшчэ маюць месца ў іх рабоце.

Звяртаючыся да педагагічнай грамадскасці, мэр сталіцы канстатаваў, што заўсёды з радасцю прымае ўдзел у традыцыйным для горада дыялогу — жнівеньскім форуме педагагічных работнікаў, які праходзяць напярэдадні новага навучальнага года.

— У педагогаў асаблівая аўра. Калі кантактуеш з вамі, атрымліваеш каштоўны вопыт. Разам з тым ёсць нюансы, якія ўносяць лыжку дзёгцю ў бочку з мёдам. Напрыклад, сітуацыя з 7-й дапаможнай школай. Няправільна, што дарагія трэнажоры стаялі гадамі і не выкарыстоўваліся з папушчальніцтва выкладчыка або кіраўніка, — звярнуў увагу старшыня Мінгарвыканкама. — Кіраўнікі ўпраўленняў адукацыі павінны быць больш прынцыповымі ў выяўленні і ацэнцы дзеянняў таго ці іншага прадстаўніка адміністрацыі школы і калектыву.

Паколькі падчас форуму прагучала заўвага наконт актуальнасці напаўнення сайтаў устаноў адукацыі карыснай для бацькоў інфармацыяй (па ўзаемадзеянні з сям'ёй, па выхаванні дзяцей і іншай), Андрэй Шорац выказаў сваё меркаванне па гэтай праблеме:

— А ці трэба нам напаўняць сайт кожнай навучальнай установы поўнай, разгорнутай інфармацыяй па ўсіх кірунках дзейнасці сістэмы адукацыі? Можа, варта стварыць у горадзе адзіны магутны інфармацыйны рэсурс, на які любы ахвотны зможа атрымаць звесткі аб тым, куды і як звяртацца пры ўзнікненні тых ці іншых праблем, знайсці прафесійную і кампетэнтную інфармацыю па актуальных пытаннях?

Гэтыя яго словы педагогі сустрэлі апладысментамі.

Ён параіў таксама быць больш настойлівымі і паслядоўнымі ў дасягненні пастаўленых мэт: «Калі трэба будаваць дашкольныя ўстановы большай магутнасці (з напаўняльнасцю да 350 чалавек), значыць, трэба іх будаваць. Шчыра кажучы, я быў упэўнены, што мы гэта пытанне ўжо вырашылі, але сёння даведаўся, што аказваецца, яно па-ранейшаму актуальнае...», — канстатаваў старшыня Мінгарвыканкама.

Жнівеньскі форум педагагічных работнікаў «Сталічная адукацыя: стратэгія фарміравання ключавых кампетэнцый XXI стагоддзя» сабраў каля 500 педагагічных работнікаў сталіцы, кіраўнікоў адміністрацый раёнаў, прадстаўнікоў Мінгарвыканкама і Міністэрства адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРЭСА І... ЦЁПЛАЕ МАЛАКО



**Непадалёк ад станцыі метро «Уручча» ў Мінску адкрыўся новы павільён «Белсаюздрука». На плошчы ў 27 квадратных метраў размясціліся стэлажы з друкаванай прадукцыяй. У вялікай колькасці прадстаўлены не толькі свежыя нумары газет і часопісаў, але і літаратурныя творы беларускіх аўтараў, дзіцячыя кнігі, школьныя дапаможнікі.**



Асобная вітрына прысвечана сувенірам з відамі Мінска і канцылярскім таварам. Акрамя таго, з павільёна можна сысці не толькі са свежым нумарам любімай газеты або часопіса, але і з кубачкам кавы і салодкім. Паклапаціліся і пра маленькіх наведвальнікаў — ім можна заказаць падагрэтае малако.

Яшчэ да афіцыйнага адкрыцця ў павільён пачалі зазіраць мясцовыя жыхары. Кожны з іх атрымліваў разам з пакупкай і сувенір.

— Тут рабіць пакупкі значна лепш, чым у кіёску, які стаяў дагэтуль, — кажа Канстанцін Русецкі. — Я вунь крыху паглядзеў свежыя нумары іншых выданняў, прыцаніўся — што браць, што не. Жонка мая любіць пагляддзець часопісы і газеты. Таксама падабаецца сістэма, як у краме: што выбраў, з тым і ідзеш у касу.

— Фармат кіёска не прадугледжвае магчымасці прамога кантакту пакупніка з выданнямі, — кажа **начальнік аддзела маркетынгу «Белсаюздрука» Вольга СІТНІКАВА.** — У павільёне ёсць магчымасць паказаць і прэзентаваць пакупніку пашыраны асартымент тавараў. Ён можа пагартаць, патрымаць у руках газету ці часопіс і спакойна зрабіць пакупку. Усё праходзіць без спешкі, якая ўласцівая куплі на хаду ў кіёску.

Да выбару пакупнікоў — творы мастацкай літаратуры, дзённікі. Напярэдадні новага навучальнага года ў продаж паступілі рабочыя сшыткі, шмат канцылярскіх тавараў — ад ручак і алоўкаў да альбомаў і фламастараў. У параўнанні з кіёскам асартымент вырас прыкладна ўтрая.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# ЦАНЮ ГАЗЕТУ ЗА КАНСТРУКТЫЎНАСЦЬ

**Для старшыні Магілёўскага абласавета дэпутатаў Дзмітрыя ХАРЫТОНЧЫКА «Звязда» — і таварыш, і дарадца.**



— Гэта выданне цікавае мне ў першую чаргу тым, што асвятляе работу Саветаў і Нацыянальнага сходу Беларусі, — кажа ён. — Трэба ведаць, бачыць, разумець, чым жыве краіна, як вырашаюцца тыя ці іншыя пытанні ў розных рэгіёнах. Тут заўсёды можна азнаёміцца з працай маіх калег з суседніх абласцей, узяць нешта цікавае на заметку і рэалізоўваць у сябе. Гэта вельмі важна, і трэба працягваць асвятляць такія моманты як мага падрабязней.

Паколькі «Звязда» — цэнтральнае рэспубліканскае выданне, на яе старонках я заўсёды знаходжу інфармацыю па сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі, пра тое, чым жыве краіна і якія ставіць перад сабой мэты. Мне цікава, як гэты матэрыял падаюць рэпарцёры газеты. Асвятляючы тыя ці іншыя пытанні, яны прапускаюць інфармацыю праз сябе як звычайныя грамадзяне краіны і завастраюць увагу на тых праблемах, якія мы, магчыма, не заўсёды заўважаем. А часта адбываецца так, што яны вельмі важныя як для асобных людзей, так і грамадства ў цэлым. І нават калі гэта датычыцца зусім іншага рэгіёна, пачынаеш задумвацца, ці правільна ў нас арганізаваны тыя ці іншыя падыходы.

Наогул газета вельмі насычаная, у ёй ёсць шмат чаго карыснага на любую тэму. Адзінае, што хацелася б пажадаць, дык гэта часцей расказваць пра тое, як працуюць народныя абраннікі ў іншых краінах. Пакуль «Звязда» больш акцэнтуе ўвагу на ўнутраных праблемах. Гэта важна. Але цікавы і замежны вопыт. Хочацца даведацца пра дзейнасць іхніх дэпутацкіх асацыяцый, якая работа вядзецца па добраўпарадкаванні, рэалізацыі праграм накшталт нашай па «чыстай вадзе». Як наогул нашы расійскія, украінскія суседзі, прадстаўнікі іншых краін вырашаюць складаныя задачы. Гэты вопыт бясцэнны, і нас не заўсёды хапае часу даехаць і вывучыць яго. А калі ў газеце паявіцца рубрыка «Мясцовае самакіраванне за мяжой» — гэта будзе вельмі цікава і пазнавальна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ На слыху

# ЦЭНЫ НА ШКОЛЬНЫ АБЕД — ПАД КАНТРОЛЕМ

**Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю зацверджана Інструкцыя аб парадку фарміравання цэн на прадукцыю грамадскага харчавання, што рэалізуецца ва ўстановах адукацыі.**

Па ўсёй краіне ўстанаўліваюцца адзіныя гранічныя максімальныя гандлёвыя надбаўкі і нацэнкі.

Гэта дазволіць забяспечыць адзіны кошт харчавання навучэнцаў як за кошт бюджэтных сродкаў, так і за кошт сродкаў бацькоў. Гэта будзе аднолькавы комплекс па адной цане.

Гранічныя максімальныя гандлёвыя надбаўкі вызначаюцца да адпускной цаны, што выключае магчымасць неабгрунтаванага завышэння цэн на сыравіну пры набыцці прадукцыі праз аптовае звяно.

Новы механізм перш за ўсё накіраваны на скарачэнне колькасці пасрэднікаў у ланцужку паставак прадуктаў і выключае магчымасць завышэння гандлёвай надбаўкі. Суб'ектам гаспадарання будзе больш выгадна набываць сыравіну і прадукты непасрэдна ў вытворцы, каб самім зарабіць больш, а не аддаваць прыбытак пасрэднікам.

Гранічныя максімальныя гандлёвыя надбаўкі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі складуць 20 %. Для астатніх установ адукацыі прадугледжана градацыя ў залежнасці ад таго, ці выкарыстоўваюць яны бюджэтныя сродкі пры арганізацыі харчавання. Калі выкарыстоўваюць, у іх надбаўкі таксама 20 %, калі не выкарыстоўваюць — 30 %. Гранічныя максімальныя нацэнкі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі складуць 40 %, у іншых установах адукацыі — 40 % (пры арганізацыі харчавання з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў) і 50 % (без прыцягнення бюджэту).

Устанаўленне адзіных гранічных максімальных гандлёвых надбавак і нацэнак не дапусціць неабгрунтаванага росту цэн на школьнае харчаванне.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# СТУДАТРАДЫ РАЗВІТАЛІСЯ З БЕЛАЭС

**У Астраўцы адбылася ўрачыстая цырымонія закрыцця працоўнага семестра на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі «БелАЭС 2018».**

Ушанавалі найлепшых байцоў зводнага беларуска-расійскага студэнцкага будаўнічага атрада імя героя-камсамольца Леаніда Лорчанкі, найлепшых наймальнікаў, а таксама ўзнагародзілі пераможцаў розных конкурсаў Усебеларускай маладзёжнай будоўлі.

У цяперашнім трэцім працоўным семестры на «БелАЭС 2018» працаваў 291 баец студэнцкіх будаўнічых атрадаў (усяго 21 атрад). Яны былі сфарміраваныя на базе найбуйнейшых устаноў адукацыі Беларусі і Расіі.

Байцы атрадаў выконвалі агульнабудаўнічыя, аддзелачныя, цепла- і электрамантажныя, бетонныя, цяслярскія, малярныя работы, ажыццяўлялі мантаж і дэмантаж апалубкі, розныя віды арміравання, мантаж крана і геадэзічныя здымкі, займаліся работамі па добраўпарадкаванні.

Як нагадалі ў Цэнтральным камітэце БРСМ, за пяць працоўных семестраў (у 2015—2018 гадах) на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі адпрацавалі 1582 чалавекі ў складзе 96 лінейных студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Акрамя таго, дадаткова ў рамках круглагадовай працоўнай занятасці (у асноўным вясной і восенню) на аб'ектах будаўніцтва БелАЭС з 2013-га да 2018 года ў складзе 86 студэнцкіх будаўнічых атрадаў адпрацавалі 837 чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Сугучча

# Нацыянальныя літаратуры крочаць у інтэрнэт

**На пасяджэнні Рабочай групы па распрацоўцы праекта Палажэння пра Міждзяржаўны гуманітарны партал «Сугучча: літаратура і публіцыстыка краін Садружнасці» (sozvuchie.by) адбылася зацікаўленая размова пра пашырэнне гэтага творчага медыйнага праекта.**

Ужо некалькі гадоў Выдавецкі дом «Звязда» праца над стварэннем і напаўненнем інтэрнэт-партала на беларускай, рускай, англійскай і іншых мовах народаў свету матэрыяламі, якія б раскрывалі тэндэнцыі сучаснага літаратурна-мастацкага працэсу. Кожнай з краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў прысвечана свая адмысловая старонка: напрыклад, «Літаратурная Беларусь», «Літаратурная Малдова», «Літаратурны Казахстан» і г. д. Асобныя інтэрнэт-старонкі расказваюць пра класікаў і сучаснікаў — пра казахскага паэта Абая, кітайскага перакладчыка Гаа Мана, лаўрэата Нобелеўскай прэміі беларускую пісьменніцу Святлану Алексіевіч і іншых. Варта зазначыць, што вялікую падтрымку ў насычэнні сайта sozvuchie.by аказваюць грамадскія мадэратары з Азербайджана — Салатын Мірзоева, Камран Назірлі, Казахстана — Святлана Ананьева, Рыма Арцем'ева, Расійскай Федэрацыі — Лула Куна, Адам Ахматукаеў, Валеры Тургай.

Палажэнне аб партале на пасяджэнні Рабочай групы адрэдагавана і падрыхтавана да наступных разглядаў — і членамі Савета па гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельнікаў СНД найперш. Дарэчы, нядаўна ў Астане вядомы расійскі грамадскі дзеяч, арганізатар многіх культурных, асветніцкіх ініцыятыў у СНД Міхаіл Швыдкой назваў «Сугучча» выдатнай пляцоўкай для кансалідацыі літаратурных сіл постсавецкай прасторы.

**Сяргей ШЫЧКО**

■ Чулі?

# Пенсіянерка згубілася ў кукурузе

**12 жніўня 71-гадовая жыхарка вёскі Дубраўкі Драгічынскага раёна пайшла ў лес у грыбы. І дадому не вярнулася. Старую пачалі шукаць, але 11 дзён пошукаў вынікаў не прынеслі. І толькі ўвечары 23 жніўня грыбнік выпадкова заўважыў жанчыну, якая ляжала на ўскрайку кукурузнага поля без сіл.**

Грыбнік выклікаў міліцыю, «хуткую» і ратавальнікаў. Бабулю неадкладна адвезлі ў Драгічынскую раённую бальніцу, дзе дыягнаставалі моцнае абязводжванне. Як паведамілі афіцыйны прадстаўнік УУС Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Дучэнка, жанчына зайшла ў кукурузнае поле і згубіла арыентацыю. Яно і нядзіўна — сцяблы гэтай культуры растуць на вышыню мінімум у тры метры, таму выбрацца з кукурузнага гушчару надзвычай складана — няма ніякіх арыенціраў. Грыбнік знайшоў пенсіянерку за 20 кіламетраў ад дома.



Больш за тое, да найбліжэйшай вёскі адтуль — пяць кіламетраў.

Зараз жыццю жанчыны нічога не пагражае.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Бяспека

# РАЗАМ СУПРАЦЬ ПАГРОЗ

**КАМП'ЮТАРНАЕ камандна-штабное вучэнне сістэмы проціпаветранай абароны членаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў праходзіла ў жніўні ў Беларусі. Падчас яго адбылося спецыяльнае пасяджэнне Каардынацыйнага камітэта, які дзейнічае пры Савеце міністраў абароны СНД.**

— Вучэнне праводзіцца ў мэтах удасканалення Адзінай рэгіянальнай сістэмы ППА Беларусі і Расіі, павышэння эфектыўнасці баявога прымянення войскаў (сіл) сістэмы ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі, — зазначыў **камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Ігар ГОЛУБ.**

Ваеннае супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД з'яўляецца неад'емнай часткай і важным фактарам развіцця Садружнасці. Адзін з найважнейшых кірункаў супрацоўніцтва ў ваеннай сферы — супрацоўніцтва ў галіне проціпаветранай абароны.

— Ключавая роля ў гэтых пытаннях заслужана належыць Каардынацыйнаму камітэту па пытаннях проціпаветранай абароны пры Савеце міністраў абароны дзяржаў СНД, — заўважыў **намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь Сяргей ПАТАПЕНКА.** — Дзякуючы камітэту паступальна развіваецца нарматыўна-прававая база, якая дазваляе рэалізаваць сумесныя і нацыянальныя інтарэсы краін СНД у разнастайных фарматах узаемадзеяння. Планава ажыццяўляецца ўдасканаленне падрыхтоўкі афіцэраў ППА. Комплексна праводзяцца мерапрыемствы аператыўнай і баявой падрыхтоўкі, сумесныя вучэнні з баявой стральбой як найвышэйшая форма праверкі баяздольнасці войскаў сіл дзяржаў.

Дзякуючы агульным намаганням у СНД ажыццяўляецца комплексны падыход у вырашэнні задач па гарантаванні бяспекі.

— На жаль, абстаноўка ў свеце пастаянна ўскладняецца, нарошчваецца патэнцыял і ваенная актыўнасць НАТА паблізу знешніх межаў Садружнасці, — паведаміў **дырэктар дэпартамента па супрацоўніцтве ў сферы бяспекі і процідзеяння новым выклікам і пагрозам Выканаўчага камітэта СНД Альберт ДРУЖЫНІН.** — У гэтай няпростай сітуацыі рэалізацыя існуючага патэнцыялу абароннага супрацоўніцтва дзяржаў СНД уяўляецца адным з ключавых момантаў, якія спрыяюць зніжэнню ўплыву негатыўных фактараў, гарантаванню надзейнай абараназдольнасці і бяспечнага развіцця нашых краін.

Імклівае развіццё тэхналогій нападу вызначыла неабходнасць пашырэння пераліку задач, што вырашаюцца аб'яднанай сістэмай ППА ПНД па супрацьдзеянні новым выклікам і пагрозам.

— Як станоўчы аспект у супрацоўніцтве адзначаем выкарыстанне атрыманага вопыту ў сумеснай дзейнасці, — кажа Альберт Дружынін. — Мы працягваем развіваць гэтую форму супрацоўніцтва. Камп'ютарнае камандна-штабное вучэнне сістэмы ППА дзяржаў СНД «Рэгіянальная бяспека — 2018» — таму сведчанне.

Падчас пасяджэння была прынята да ведама інфармацыя аб досведзе выкарыстання беспілотнікаў падчас баявых дзеянняў у Сірыі. У перагаворах сам-насам прадстаўнікі Расіі і Беларусі абмеркавалі рэалізацыю пагаднення аб сумеснай ахове знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы ў паветранай прасторы і стварэнні адзінай рэгіянальнай сістэмы проціпаветранай абароны.

Асноўная фаза вучэнняў праводзілася на базе дапаможнага пункта кіравання камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў ППА Беларусі. На сцяне ўсталяваны велізарны панарамны экран.



Фота БелТА.

На карце ў рэжыме рэальнага часу паказваецца перамяшчэнне самалётаў у паветранай прасторы Беларусі і прылеглай тэрыторыі сумежных краін. Калінінградская вобласць падсвечана асобна.

За камп'ютарамі сядзяць афіцэры аператыўнай групы з арміі ПКС Расіі і ВПС і ППА Беларусі. Яны ўважліва глядзяць у маніторы. Раз-пораз раздаюцца тэлефонныя званкі і ажывае рацыя.

— Гэты пункт з'яўляецца складовай часткай каманднага пункта Адзінай рэгіянальнай сістэмы проціпаветранай абароны Беларусі і Расіі, — кажа **начальнік галоўнага штаба, першы намеснік камандуючага ВПС і войскамі ППА генерал-маёр Сяргей ТРУС.** — Для ўдзелу ў гэтых вучэннях была ўпершыню створана аператыўная група для забеспячэння працы камандуючага Адзінай рэгіянальнай сістэмай.

Праца службовых асоб арганізавана на аўтаматызаваных рабочых месцах дапаможнага пункта. Ён аснашчаны комплексам трэнажна-імітацыйных сродкаў «Пліса», прызначаным для навучання і ўдасканалення навыкаў працы афіцэраў аператыўнага і аператыўна-тактычнага звенняў кіравання. Дадаткова выкарыстоўваюцца і праграмныя комплексы, створаныя беларускімі спецыялістамі і прынятыя на забеспячэнне Узброеных Сіл. Комплекс «Вучэнне» выкарыстоўваецца для адпрацоўкі графічных дакументаў, а сістэма мадэлявання баявых дзеянняў «Свіслач» дапамагае ацэньваць эфектыўнасць прынятых рашэнняў.

Пры правядзенні камп'ютарнага камандна-штабнога вучэння атрымалася сумясціць тэарэтычную і практычную работу.

— Падчас практычнага этапу вучэнняў мы адпрацавалі такія сітуацыі, якія найбольш часта могуць сустрэцца, — кажа Ігар Голуб. — Першая — згон паветранага судна тэрарыстамі. Таксама мы праверылі алгарытм дзеянняў падчас парушэння дзяржаўнай мяжы баявым паветраным суднам.

Трэці эпізод — з-за форс-мажорных абставін яно згубіла візуальную арыенціроўку. У тым выпадку, калі лётчык і экіпаж не могуць сарыентавацца, дзе яны знаходзяцца, дзяжурныя сілы па проціпаветранай абароне павінны прыйсці ім на дапамогу. У гэтай сітуацыі мы ажыццяўляем перахоп. Што гэта такое? Мы падводзім паветранае судна-перахватчыка да таго, якое страціла арыенціроўку, пасля чаго і выводзім яго на зададзены маршрут. Калі камандзір экіпажа дакладвае аб тым, што арыенціроўка адноўлена, мы лічым, што задача выканана. Гэта вучэнне праводзілася не толькі на картах і камп'ютарах, яно адпрацавана з практычнымі элементамі. Па выніках праведзенага мадэлявання і практычнай работы вызначылася эфектыўнасць дзейнай сістэмы і быў выпрацаваны аптымальны баявы склад для выканання пастаўленых задач у рамках Адзінай рэгіянальнай сістэмы проціпаветранай абароны. Мяркуецца, што вынікам вучэння стане яшчэ большае ўмацаванне адносін з Паветрана-касмічнымі сіламі Узброеных Сіл Расіі пры выкананні задач, якія пастаўлены перад проціпаветранай абаронай ■

### Тым часам

З 16 ліпеня па 12 жніўня ў Разані праходзіў міжнародны конкурс лётных экіпажаў «Авіядартс-2018». Ёсць чым пахваліцца і нашым лётчыкам! Нашы каманды вярнуліся адтуль з прызавымі месцамі.

— У намінацыі «Штурмавая авіяцыя» нашы экіпажы занялі другое месца, — кажа Ігар Голуб. — Мушу зазначыць, што выступалі яны на асвоеных тыпах новых самалётаў Як-130. У намінацыі «Вайсковая авіяцыя на транспартна-баявых верталётах» беларусы таксама сталі другімі. Тут яны выконвалі пастаўленыя задачы на новых верталётах Мі8МТВ-5. А ў спаборніцтвах «Вайсковая авіяцыя на баявых верталётах» нашы лётчыкі, якія ўзняліся ў неба на верталётах Мі-24, заваявалі бронзу.

■ Змена

# АРМЕЙСКІЯ ВАКАЦЫІ

## Як праходзілі канікулы ў патрыятычным лагеры «Лідар»



**У 120-й асобнай механізаванай брыгадзе скончыў работу раённы выязны лагер «Лідар». Трыццаць вучняў 3—10 класаў на працягу дзевяці дзён жніўня спасцігалі таямніцы армейскага побыту, удзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах, наведвалі экскурсіі і пазнаёміліся з гісторыяй Узброеных Сіл.**

Браты **Аляксей і Міхаіл ЦЭНДЗЕРЫ** вучацца ў 84-й сярэдняй школе. Да гэтага ў лагерах з ваенным ухілам падлеткі яшчэ не былі.

— Нам расказаў пра гэты лагер сацыяльны педагог. А тут паказалі, як праходзіць паласу перашкод, збіраць і разбіраць аўтамат Калашнікава... Самае складанае — гэта рана ўстаць. Пад'ём — а шостай гадзіне раніцы. І самае галоўнае — тут усё зусім не так, як у кіно.

Падлеткаў курыравалі выхавальнікі і ваеннаслужачыя, якія расказвалі пра тонкасці службы. І як паказвае практыка, удзел у такіх лагерах мае пасля вялікі эфект. Калі падлеткі становяцца паўналетнімі, іх не палохае перспектыва тэрміновай службы, яны ўжо ведаюць і ўяўляюць, што менавіта будзе чакаць іх пасля прызыву ў войска.

— Праграмай спланаваны разнастайныя мерапрыемствы для выхаваўчай работы, культурнай праграмы, а яшчэ мы прышчэпліваем навыкі, якія спатрэбяцца ў жыцці, — кажа **старшы афіцэр аддзялення ідэалагічнай работы вайсковай часці 04147 Рыгор СІВІЦКІ.** — Хлопчыкі вучацца, як правільна распаліць вогнішча, як паводзіць сябе ў лесе, каб не заблукаць. І ўжо відаць, як яны аб'ядналіся за гэты час. А каб адчувалі сябе яшчэ больш упэўнена, мы праводзім і псіхалагічныя трэнінгі. Да таго ж яны пастаянна бачаць побыт ваеннаслужачых тэрміновай службы як ён ёсць і кантактуюць з імі. Так армія перастае быць для хлопцаў загорнутай кнігай.



Фота БелТА.

На фоне астатніх хлопцаў вылучаецца **Дзмітрый БУЙНІЧ,** які камандуе першым узводам. Хлопец перайшоў у дзявяты клас, але здаецца дасведчаным і дысцыплінаваным не па гадах.

— Я сачу за парадкам, дублюю каманды камандзіраў, буджу хлопцаў раніцай. Я адказваю і за дысцыпліну. Калі нехта з хлопцаў дапусціў парушэнне, то адказвае і ён, і я. Мне падабаецца тое, што лагер бясплатны, арганізавана пяціразовае харчаванне. Па душы парадак і дысцыпліна ў часці. У мяне бацька — падпалкоўнік запасу. І яшчэ з самага маленства ён браў мяне з сабой на службу. Так я і прывык да вайсковага побыту. Больш за тое, вельмі хачу служыць і паступлю ў будучыні ў Вайсковую акадэмію.

А вось **пятнаццацігадовы Андрэй ЯФРЭМАЎ** ужо паўтара года захапляецца паркурам. Гэта майстэрства перамяшчацца па любым рэльефе ў любых абставінах. Вучыць пад кантролем дарослых таямніцам гэтага майстэрства і іншых хлопцаў. Сам жа спасціг іх дзякуючы шматлікім відэаролікам у інтэрнэце.

— Я пабачыў, як многія мае равеснікі праадольваюць паласу перашкод. І вырашыў паказаць, як гэта можна зрабіць лепш. Можам і некаторым вайскоўцам ужо даць фору.

**Начальнік лагера Валерыя ШВЕД** знаходзілася ў часці ўвесь дзень — ад восьмай раніцы да дзявятай вечара. Хлопчыкі літаральна акружылі дзяўчыну і наперабой казалі, што вельмі цёпла да яе ставяцца.

— Зараз у лагеры 24 падлеткі: некаторыя пакінулі часць па сямейных абставінах. Сярод дзяцей шасцёра стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Так, можа, не ўсе хлопцы простыя, але ўсе яны аб'ядналіся. І на некалькі дзён мы сталі адной вялікай сям'ёй.

Мяркуецца, што ў спартыўна-патрыятычных лагерах за лета адпачнуць больш за 10 тысяч навучэнцаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■

■ Аты-баты



# ПАД'ЁМ — А 7-й ГАДЗІНЕ

## Цікавы эксперымент праходзіць у беларускай арміі

**КАПІТАЛЬНЫ рамонт — рэч няпростая, але вельмі карысная, паколькі ён скіраваны на тое, каб палепшыць побытавыя ўмовы. Якраз ён і праходзіць у часцях і злучэннях Узброеных Сіл Беларусі. Сярод іншага, ён істотна зменіць і 72-і Аб'яднаны вучэбны цэнтр падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў.**

У ім дзве воінскія часці ўжо змянілі прапіску на новыя казармы. Яны абсталяваны душавымі кабінамі і пральнымі машынамі. Адчыніла свае дзверы і чацвёртая сталовая. Неўзабаве скончыцца рамонт двух клубаў. А ў верасні пачнуцца работы яшчэ ў адной сталовай і ў медыцынскай роце.

Акрамя таго, у навучальным цэнтры быў праведзены цікавы эксперымент. У чатырох воінскіх часцях быў крыху зменены распарадак дня. Пад'ём пачаў адбывацца не а 6-й раніцы, а на гадзіну пазней. І аказалася, што гэта станоўча паўплывала не толькі на якасць навучання, але і на маральна-псіхалагічны стан ваеннаслужачых. Менавіта таму вучэбныя вайсковыя часці і перайшлі на пад'ём а 7-й.

— Згодна з агульнавайсковымі статутамі сон ваеннаслужачага мусіць складаць 8 гадзін, — кажа **начальнік 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў гвардыі палкоўнік Уладзіслаў БУДЗІК.** — Мы падалі прапановы крыху змяніць гэтае палажэнне, каб сон складаў не менш за 8 гадзін.

У месцах размяшчэння асабовага складу запрацавала новая сістэма відэаназірання. У адной казарме працуюць 64 камеры. 14 з іх размешчаны непасрэдна там, дзе салдаты жывуць, яшчэ па дзве — на лесвічных пралётах. Пад увагу аб'ектыва трапляе ўсё, што адбываецца ў будынках. Карцінка з яго выводзіцца на спецыялізаваны вялікі манітор і захоўваецца ў відэаархіве на працягу трох з паловай тыдняў. Якасць карцінкі дазваляе разгледзець усё да дробязей, паколькі сігнал перадаецца ў фармаце HD. Пішуць камеры і гук — адчувальныя мікрафоны ловяць нават ціхі шэпт. Акрамя таго, камеры на ўваходзе скануюць твар ваеннаслужачага і распазнаюць яго, што дазваляе адсочваць усе перамяшчэнні і дзеянні ў казарме. У тым ліку — і сачыць за месцамі захоўвання зброі.

— Такой сістэмай аснашчаны пяць вайсковых часцей, — сцвярджае Уладзіслаў Будзік. — Паступова яна будзе ўсталявана і ў іншых казармах. А таксама — у медроце і сталовай пасля завяршэння капітальнага рамонту будынкаў.



Тэатр, як вядома, пачынаецца з вешалкі, а побыт у казарме — з увахода. Пасля капітальнага рамонту на ўваходзе ў будынак, дзе жывуць салдаты 59-й школы па падрыхтоўцы спецыялістаў па эксплуатацыі аўтамабільнай тэхнікі і рамонтных падраздзяленняў, з'явілася велізарнае электроннае табло. Яно працуе ў рэжыме звычайнага гадзінніка-тэрмометра. Але праз некалькі секундаў карцінка змяняецца. Радавога Каляду з 3-й вучэбнай роты віншуюць з днём нараджэння.

Ужо чатыры гады, як казармы пераведзены на гарачае водазабеспячэнне. Двух'ярусныя ложкі адышлі ў мінулае. На тумбачках — рамкі з фотаздымкамі. Пакоі для ўмывання абсталяваны пральнымі машынамі і душавымі кабінамі.

Цікаўлюся: як часта могуць салдаты званіць дадому?

— Мы дазволілі такім чынам захоўваць фотаздымкі родных і блізкіх салдат, — кажа **начальнік 59-й школы падрыхтоўкі спецыялістаў па эксплуатацыі аўтамабільнай тэхнікі і рамонтных падраздзяленняў падпалкоўнік Эдуард НІКУЛЬЧА.** — Гэта добра паўплывала на мікраклімат. Мабільныя тэлефоны ў нас выдаюцца толькі ў вольны ад вучобы час.



Фота БелТА.

Між тым у навучальных класах устаноўлены комплексныя трэнажоры. Курсанты асвойваюць тры спецыяльнасці — камандзіра танка Т-72Б, наводчыка-аператара і механіка-кіроўцы. **Радавы Алег ЧАРКАС** вядзе на экране манітора танк, нібыта ў камп'ютарнай гульні. Дэтальна прамалёўваюцца ўсе магчымыя няроўнасці. Але на гэтым падабенства і заканчваецца. Асобна на экран выведзена прыборная панэль — усе лямпы, рычагі, як і ў сапраўдным танку.

— Я рыхтуюся да сапраўднага кіравання. Споўнілася толькі тры месяцы, як служу. Але ўжо праехаў не адзін кіламетр у сапраўдным танку. Акліматызацыя праходзіць вельмі хутка, розніцы паміж віртуальным і рэальным кіраваннем вельмі мала.

Але, як кажуць, вайна вайной, а абед па раскладзе. У 72-м вучэбным цэнтры пасля рамонту адкрылася сталовая. Што ж у ёй новага?

— У нас харчуюцца больш за тысячу ваеннаслужачых, — кажа **начальнік харчовай службы 72-га Аб'яднанага вучэбнага цэнтра капітан Аляксей ДЗЯЛЕНДЗІК.** — Рацыён разнастайны. Штомесяц мы апытваем ваеннаслужачых і стараемся падстроіцца пад іх густы. Просяць бульбу фры, сушы. Але зразумела, што такую ежу мы ў салдацкі рацыён уключыць не можам. Большасць пісалі, што не хапае бульбянога пюрэ. Мы зрабілі так, каб 3-4 разы на тыдзень яго давалі. Сталі крыху часцей даваць і боршч па-хатняму. І мы імкнёмся максімальна зрабіць так, каб салдаты харчаваліся як дома.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

# Беспілотнікі, конны катыльён і цяжкая артылерыя

**У падмаскоўнай Кубінцы на тэрыторыі кангрэсна-выставачнага цэнтра «Патрыёт» у гэтыя дні праходзіць адна з найбуйнейшых расійскіх выставак — Міжнародны ваенна-тэхнічны форум «Армія-2018».**

Яго ўдзельнікамі сталі звыш 1200 кампаній з амаль двух дзясяткаў краін свету, а з афіцыйным візітам выстаўку наведалі 102 дэлегацыі. Свае нацыянальныя экспазіцыі прадставілі Арменія, Беларусь, Кітай, Пакістан, Індыя, Казахстан, Славакія і Турцыя.

Сёлета на форум прыехала звыш 20 беларускіх арганізацый і кампаній рознай формы ўласнасці і ведамаснага падпарадкавання. Яны прывезлі самыя сучасныя і перспектыўныя ўзоры прадукцыі ваеннага і двайнога прызначэння.

Міністр абароны Расійскай Федэрацыі Сяргей ШАЙГУ азнаёміўся з экспазіцыямі абаронных прадпрыемстваў, у тым ліку — з прадукцыяй, што дэманстравалася на калектыўным стэндзе Рэспублікі Беларусь, арганізатарам якога выступіла «Белспецзнештэхніка». Намеснік старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, кіраўнік беларускай дэлегацыі Дзмітрый Пантус праінфармаваў аб магчымасцях і перспектывах айчыннай абаронкі і яе ўдзеле ў сумесных беларуска-расійскіх праектах.

На цырымоніі адкрыцця выстаўкі прысутнічаў міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ, які наведаў канцэрн «Калашнікаў» і сустрэўся з прадстаўнікамі Навукова-вытворчай карпарацыі «Уралвагонзавод». Як паведамілі ў Міністэрстве абароны, у межах сустрэч на Міжнародным ваенна-тэхнічным форуме «Армія-2018» беларуская дэлегацыя заключыла кантракт на пастаўку радыёлакацыйнай станцыі «Сопка» з канцэрнам «Алмаз-Антэй». Таксама ва Узброеныя Сілы Беларусі будзе накіравана чарговая партыя снайперскіх вінтовак вытворчасці канцэрна «Калашнікаў». З кіраўніцтвам «Уралвагонзавода» прайшлі перагаворы наконт далейшай мадэрнізацыі танкаў Т-72 да ўзроўню Т-72Б3, а з «Верталётамі Расіі» — аб постгарантыйным суправаджэнні верталётаў Мі-8МТВ-5.

Афіцыйная дэлегацыя Дзяржкамваенпрама таксама правяла паспяховыя перагаворы з першым намеснікам Федэральнай службы па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве Андрэем Байцовым і міністрам абароннай і аэракасмічнай прамысловасці Рэспублікі Казахстан Бейбутам АТАМКУЛАВЫМ. На сустрэчах абмяркоўваўся ход рэалізацыі сумесных праектаў і азначаны асноўныя напрамкі далейшага двухбаковага супрацоўніцтва.

Акрамя таго, калектыўную экспазіцыю беларускай абаронкі наведаў міністр абароны Буркіна-Фасо Жан-Клод Буда. Яго зацікавілі беспілотныя лятальныя апараты, баявыя модулі дыстанцыйнага кіравання. У сваю чаргу, міністр абароны Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, які агледзеў экспазіцыю «Белтэхэкспарта», праявіў цікавасць да карыснай нагрузкі для беспілотнікаў і магчымасцяў па іх сумеснай вытворчасці.

**Сяргей ЭМБЕРГ.**

# ВАЙСКОВАЕ БРАТЭРСТВА

**Начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Алег Белаконеў наведаў з афіцыйным візітам Кітай. Ён сустрэўся з генерал-палкоўнікам Лі Цзочэнам, начальнікам Аб'яднанага штаба Цэнтральнага ваеннага савета Кітайскай Народнай Рэспублікі.**

Падчас перагавораў бакі падкрэслілі важнасць умацавання і развіцця партнёрскіх адносін паміж нашымі краінамі ў ваеннай сферы, пацвердзілі станоўчую дынаміку развіцця ўсебаковага, давернага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва на падмурку моцнага сяброўства. Таксама былі абмеркаваныя актуальныя пытанні далейшага развіцця двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва ў такіх галінах, як сумесная баявая падрыхтоўка, ваенная адукацыя, узаемадзеянне ў рамках ваеннага складніка Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

# ДЭСАНТ ІДЗЕ Ў АТАКУ

**У Паднябеснай адбылося сумеснае беларуска-кітайскае антытэрарыстычнае вучэнне «Атакуючы сокал».**

Выконваць баявыя задачы ў кітайскі горад Цзінань адправіліся ваеннаслужачыя 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады. Разам са сваімі калегамі з процілеглага боку еўразійскага мацерыка яны адпрацавалі спецыяльныя дзеянні. Падчас актыўнай фазы вучэння быў праведзены розыгрыш тактычных эпізодаў сумесных дзеянняў падраздзяленняў спецыяльнага прызначэння дзвюх краін па вызваленні заложнікаў і знішчэнні тэрарыстаў. Як зазначыў начальнік штаба — першы намеснік камандуючага сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл палкоўнік Віктар Гулевіч, асабовы склад атрымаў бясцэнны досвед, паказаўшы выдатную вывучку, а таксама імкненне і здольнасць выконваць баявыя задачы на найвышэйшым узроўні.

# СТАЛІ МЕДАЛІСТАМІ

**Тры ўзнагароды заваявалі прадстаўнікі Узброеных Сіл Беларусі на чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы ў асабістым заліку. Прапаршчык Вольга Мазуронак стала найлепшай у марафоне. Максім Недасекаў, які з'яўляецца спартсменам-інструктарам Спартыўнага камітэта Узброеных Сіл, выйграў сярэбраны медаль на спаборніцтвах у скачках у вышыню. На рахунку малодшага сяржанта кантрактнай службы Дзмітрыя Дзюбіна — «бронза» ў спартыўнай хадзе на 50 кіламетраў.**

Таксама нашы армейскія спартсмены вярнуліся з двума медалямі на міжнародных спаборніцтвах серыі Гран-пры па стральбе з лука. Радавы Кірыл Фірсаў выйграў «золата» ў складзе каманды. А спартсмен-інструктар Спарткамітэта Узброеных Сіл Карына Дзёмінская заняла трэцяе месца ў асабістым заліку.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Да Дня беларускага пісьменства

# ІВАНАВА ЧАКАЕ ГАСЦЕЙ



Старажытнае Янава, якое сёлета адзначае 595 гадоў, абноўленым і прыгожым рыхтуецца сустрэць гасцей. Цэнтральныя мерапрыемствы пройдуць у гарадскім парку. І тут работы па добраўпарадкаванні набліжаюцца да завяршэння. З'явіліся новыя дарожкі, якія выклалі там, дзе раней былі пратаптаныя сцежкі. Усталявана новае асвятленне. Узведзены адмысловыя спартыўныя пляцоўкі.

Парк плошчай у 25 гектараў ужо 1 верасня ператворыцца ў адзін вялікі амфітэатр, дзе амаль цэлы дзень будзе доўжыцца выступленне духавых аркестраў. Яны, дарэчы, прыедуць у Іванава з усёй вобласці, каб правесці заключны канцэрт-агляд па выніках абласнога конкурсу. На наступны дзень парк стане месцам Фестывалю кнігі і друку.



А ўсяго, паводле слоў **начальніка аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Іванаўскага райвыканкама Галіны КЛІМОВІЧ**, у праграме святкавання запланавана правядзенне больш чым 80 мерапрыемстваў. Пад імпрэзы будзе задзейнічана каля двух дзясяткаў пляцовак. Першы дзень амаль поўнасцю літаратурны. Міжнародны круглы стол беларускіх і замежных пісьменнікаў «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» з удзелам літаратараў 15 краін пройдзе ў Варацэвічах, у музейным комплексе імя Напалеона Орды.

Варацэвічы выбраны адной з пляцовак Дня пісьменства не выпадкова. Гэта малая радзіма аднаго з самых вядомых выхадцаў з гэтых мясцін. Напалеон Орда — не проста мастак, кампазітар, літаратар XIX стагоддзя, гэта ўжо своеасаблівы брэнд Іванаўшчыны. Помнік яму стаіць у самым цэнтры горада. Больш за дзесяцігоддзе бронзавы Напалеон сустракае ўсіх гасцей невялікага палескага гарадка. А ў Варацэвічах працуюць музей і галерэя, дзе сабраны копіі яго акварэляў і графічных работ. Дзякуючы гэтаму нястомнаму рупліўцу пэндзля і алоўка мы можам бачыць, якімі былі палацы, сядзібы, фальваркі ў Беларусі і суседніх краінах. Многія з гэтых пабудоў, на жаль, засталіся толькі ў малюнках Напалеона Орды. Ён пакінуў таксама музычныя творы, публіцыстычныя і біяграфічныя артыкулы. Для ахвотных удзельнікаў свята запланаваная экскурсія ў Варацэвічы. Дарэчы, тое, што паказваюць турыстам: — і музей, і галерэю, — можна назваць першай чаргой музейнага комплексу. На яго далейшае развіццё патрабуюцца сродкі. Грошы на добрую справу зараз збіраюць прафсаюзы вобласці. На адным з мерапрыемстваў падчас святкавання прафсаюзныя актывісты абяцалі падвесці прамежкавыя вынікі зробленага.



Навукова-практычная канферэнцыя «Іванаўскія чытанні» пройдзе ў раённай бібліятэцы імя Панфёрава. Падчас традыцыйнага фестывалю кнігі і друку выдаўцы і аўтары правядуць прэзентацыі найлепшых выданняў мастацкай, навуковай і дзіцячай літаратуры. Грамадска-культурная акцыя «Чытаем Купалу разам» збярэ аматараў лірыкі класіка. Яшчэ арганізатары адзначылі, што мясцовыя паэты прачытаюць свае вершы... з балконаў. А што, можа, такім чынам яны знойдуць новых прыхільнікаў сваёй творчасці. І чытачы дружна рушаць у новую кнігарню, каб набыць зборнікі вершаў. Менавіта ў кніжную краму, бо яна будзе ўрачыста адкрытая 1 верасня. Мабыць, і назву загадзя прымеркавалі да адкрыцця, магазін называецца «Верасень».




Зараз у Іванаве падыходзіць да завяршэння пленэр разьбяроў па дрэве. Там працуюць дзевяць майстроў, якія ўвасабляюць у дрэве вобразы знакамітых людзей, што пакінулі адметны след у літаратуры і мастацтве Іванаўшчыны. Іх скульптуры з'явяцца каля цэнтральнай аркі гарадскога парку. А ўрачыстае падвядзенне вынікаў пленэру і стане адным з мерапрыемстваў Дня пісьменства.

Афіцыйная цырымонія адкрыцця адбудзецца а 12-й гадзіне 2 верасня на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы ў парку. Тэатралізаваная дзея «Малой радзіме пакланюся» раскажа пра гісторыю Янава. Адразу за гэтым пройдзе ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. А потым эстафету свята ўрачыста перададуць Слоніму, дзе будзе наступны Дзень пісьменства.

У праграме таксама — гашэнне памятных маркі і паштовага канверта, майстар-класы па традыцыйных рамёствах, выстаўка-продаж сувенірнай прадукцыі. Часткай святкаванняў традыцыйна становіцца рэспубліканская навукова-асветніцкая акцыя «Дарога да святыняў» з Дабратворным агнём ад Гроба Гасподняга, у якой прымаюць удзел прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі, духавенства. Гэтым разам удзельнікі экспедыцыі правядуць духоўна-асветніцкія сустрэчы з жыхарамі вёсак Адрыжын і Махро, супрацоўнікамі і адпачывальнікамі санаторыя «Алеся», пасадзяць на тэрыторыі беларускамоўнай школы № 4 у Іванаве Сад малітвы.

З даўніх часоў у мясцовых жыхароў у пашане такі жарт: «Якое Іванава? Тое, што каля Масквы? Не, тое што каля Моталя». Сапраўды, было б дзіўна, каб святкаванні абышлі знакавае мястэчка. Сам Моталь з яго багатым досведам «Мотальскіх прысмакаў» каго хочаш можа навучыць, як праводзіць розныя фэсты. Дык вось, у Мотальскім музеі народнай творчасці пройдуць краязнаўчыя чытанні па рукапісе Марыі Саковіч 1877 года «Сяльчане мястэчка Моталь і іх песні». Будзе згаданы і Ян Пратасовіч, паэт, асветнік, дзяржаўны дзеяч XVI стагоддзя, які нарадзіўся ў вёсцы Магільна, — тое месца даўно ўвайшло ў межы горада Іванава.

Як расказаў **намеснік старшыні Іванаўскага райвыканкама Рыгор СЫСА**, скончаны мантаж памятнага знака, прысвечанага Дню беларускага пісьменства, 25-му па ліку. Знак называецца «Янава слова», ён уяўляе сабой сонечны гадзіннік, у аснове якога вялікі камень. У цэнтры — бронзавае пяро, цень ад якога падае на лічбы, нанесеныя на камень. Урачыстае адкрыццё гэтага знака і стане першым мерапрыемствам афіцыйнага пачатку свята.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# У ПРАДЧУВАННІ СВЯТА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

15 тысяч удзельнікаў — менавіта столькі ахвотных сабраў сёлета конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка», фінал якога пройдзе 1 верасня ў Іванаве. 12 самых таленавітых і перакананаўчых дзяцей і падлеткаў, якія перамаглі ў рэгіянальных этапах і паўфінале, паспаборнічаюць за прызы ад Міністэрства адукацыі — ганаровыя дыпломы і пуцёўкі ў знакаміты летнік «Зубраня».

І канешне, адной з цэнтральных падзей Дня пісьменства стане цырымонія ўручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Паводле слоў члена журы конкурсу, першага намесніка старшыні Беларускага саюза пісьменнікаў Алены СТЭЛЬМАХ, сёлета на яе прэтэндавалі 59 твораў, пераважная большасць з якіх — беларускамоўныя, але на суд журы экспертная камісія прэміі вылучыла 51 кнігу. Высокай абяцае быць канкурэнцыя сярод паэтаў і аўтараў дзіцячай літаратуры, у той час як намінацыі «Драматургія» і «Літаратуразнаўства» сабралі менш за ўсё прэтэндэнтаў. Аднак у любым выпадку ўзнагароды атрымаюць толькі найлепшыя — прычым, што асабліва прыемна для літаратараў, з гэтага года грашовы памер прэміі значна павялічыўся і складае 100 базавых велічынь (у намінацыі «Дэбют» — 50 базавых велічынь).

Словам, праграма юбілейнага Дня пісьменства — як заўжды, насычаная, і гэта менавіта той выпадак, калі лепш адзін раз пабываць на свяце, чым пералічваць усе яго пункты і моманты. Тым больш гасцей у Іванаве ўжо даўно чакаюць і ўсіх гатовы прыняць з адкрытым сэрцам.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**ЗАО «Белреализация»**
**объявляет о проведении торгов**

Публичные торги в электронной форме по продаже имущества в исполнительном производстве будут проведены: **10 сентября 2018 г.**, **начало в 09.00, окончание в 18.00,** на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY. Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. тел.: (8017) 298-53-53, +37529 690-54-09, e-mail: marketing@zalog.by. Телефон для ознакомления и осмотра лотов +37529 698-53-03.

| Наименование лота | Начальная цена, бел. руб. | Местонахождение | Собственник |
|---|---|---|---|
| Автобетоносмеситель «КАМАЗ» 651162 58147, 2010 г. в. | 9 680,00 | г. Гомель, Индустриальный проезд, 12 | ООО «Строительная компания «СНД» |
| Автобетоносмеситель «КАМАЗ» 65115 62581447Z, 2008 г. в. | 6 240,00 | | |
| Изолированное помещение (транспортного назначения) с инв. № 350/D-174598, доля в праве собственности 27/625 | 15 900,00 | г. Гомель, ул. Крестьянская, 11/3 | С. Н. Карась |

Для участия в торгах необходимо: 1) **в срок по 7 сентября 2018 г. до 16.00** перечислить задаток по выбранному лоту в размере 10 % от начальной стоимости лота; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY. Величина первого шага торгов составляет 5 % от начальной стоимости лота. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наибольшую цену за лот. Победитель торгов (покупатель) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов. Подробнее на WWW.BELTORGI.BY.

■ Фестываль

Анжаліка КРАШЭЎСКАЯ:

# «Прывыканне да свайго роднага прымушае думаць, што ўсё чужое — шкоднае»

**Для аматараў сцэны кожная восень адзначана Міжнародным форумам тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ», які штогод паказвае публіцы найлепшыя дасягненні беларускага асяроддзя, а таксама прадстаўляе цэлы шэраг замежных пастановак, здольных здзівіць, збянтэжыць і нават шакаваць. Гэтым разам форум пачнецца 20 верасня з праграмы Belarus Open і ў прыватнасці «Рэвізора» Мікалая Пінігіна. Публіцы будуць прадстаўлены дзесяць беларускіх і дзевяць замежных спектакляў з Паўднёвай Карэі, В'етнама, Польшчы, Францыі, Літвы і Латвіі, Бельгіі, Расіі, а таксама ўпершыню на «ТЭАРТе» — з Фінляндыі. Форум працягнецца да 16 кастрычніка, і білеты ўжо даступныя ў касах, а мы тым часам паразмаўлялі з дырэктарам і адборшчыкам Міжнароднай праграмы Анжалікай КРАШЭЎСКАЙ.**

***— Міжнародная праграма «ТЭАРТа» вельмі інтрыгоўная. Ці ёсць у ёй нешта, чаго беларуская публіка пакуль не бачыла?***

— Так, трылер «Арктыка». У тэатры такі кінажанр глядач наўрад ці сустракаў, я думаю, і самі прафесіяналы зададуцца пытаннем, як яго можна паставіць на сцэне. Тут і сапраўды шмат адсылак да кіно, не кажучы ўжо пра тое, што тэатр, гэтак жа хутка, як кінасфера, зрэагаваў на наваколле і ўцягнуў у сябе пэўныя яго працэсы. Спектакль дастаткова цікавы і відовішчны — ты існуеш ці то ў тэатральнай пастаноўцы, ці то ў фільме, ці то ў рэальнасці, ці то ў мастацкай выдумцы. Калі сядзіш у зале, — адчуваеш, што знаходзішся на нейкім памежжы.

***— Як у «Арктыцы» перадаецца атмасфера кіно?***

— Самае відавочнае — вялікай колькасцю прыёмаў, што адсылаюць да кінематографа і, дарэчы, даўно існуюць у еўрапейскім тэатры, праз выкарыстанне камер і праекцый. Яны перадаюць дзеянні на лодцы, што плыве ў Арктыку, і не проста ўражваюць гледача тэатральнай мовай, а ствараюць адчуванне, што гэта рэальнасць.

***— Форум кожны год паказвае харэаграфічны тэатр, а сёлета тут будзе адразу тры такія пастаноўкі. Гэта адлюстраванне пэўнай тэндэнцыі ў сусветным тэатры?***

— Мне хочацца прывозіць розныя жанры, але з улікам інтарэсаў публікі, а шмат каму падабаецца сучасны танец. Карэйская пастаноўка «Даркнэс Пумба» будзе экзотыкай, хоць у нас ужо быў драматычны тэатр з Паўднёвай Карэі, а тут не проста харэаграфічны спектакль, але і музычны. Выплеск эмоцый другой культуры і ментальнасці з жывым галасавым суправаджэннем — гэта неймаверна. У пастаноўцы «Czterdzieści» з Познані задзейнічаны прафесійныя танцоры, што прайшлі школу Пазнанскага тэатра танца, які спецыяльна рыхтуе танцораў на базе балетнай школы. Немагчыма было адмовіцца ад ідэі паказаць дзве абсалютна розныя рэчы з краіны, якая сёлета святкуе стагоддзе незалежнасці. «Czterdzieści» Джо Стрэмгена — пастаноўка не тое каб халоднага нарвежскага рэжысёра, але аўтара з іншым складам мыслення, з польскімі акцёрамі. Гэта такі культурны мікс, у спектаклі паказваецца гістарычны кантэкст, усё адбываецца вакол лічбы сорак, якая суправаджае жыццё галоўнай гераіні і не толькі яе. Другі польскі спектакль — «Жніво» польскага рэжысёра Ігара Гашкоўскага. У ім ёсць пэўная рытуальнасць, звязаная з нараджэннем і смерцю, прысвечаныя збору ўраджаю песнапенні, — гэта блізка і беларускай публіцы. Мне падалося важным паказаць розныя культуры ў танцы, абсалютна не падобныя адна на адну пастаноўкі, здольныя прынесці новыя адчуванні, асабліва калі паглядзець адразу тры харэаграфічныя спектаклі.

> **«У беларускую праграму мы збіраем тое, што можа выклікаць цікавасць нагледжаных замежных гасцей, таму што не кожны гатовы ехаць сюды і марнаваць час».**

***— А ўвогуле міжнародная праграма — сёлета яна ўключае ў сябе дзевяць пастановак — неяк адлюстроўвае вобраз сучаснага сусветнага тэатральнага мастацтва?***

— Калі я будую праграму, не думаю аб нейкім цэльным вобразе, але мне хочацца знаёміць беларусаў з тым, што прысутнічае ў тэатральным кантэксце свету. Пры гэтым я не магу не ўлічваць інтарэсы нашых прафесіяналаў і гледачоў, таму не бяру нейкія радыкальныя рэчы. Лічу, што знаёміць з сусветным тэатрам трэба паступальна: гэта не кінематограф, публіка якога круглы год мае магчымасць глядзець кіно любой краіны свету. Таксама мне хочацца паказваць дагэтуль непрадстаўленыя культуры, як сёлетні фінскі фокус, які ў тым ліку адлюстроўвае сыход у бок капрадукцыі, даўно ўласцівы сусветнаму тэатру. Адразу некалькі калектываў удзельнічалі таксама ў стварэнні французска-в'етнамскага «Сайгона». Гэта не проста капрадукцыя, але і закрананне агульнага мінулага: праз персанажаў расказваецца гісторыя Францыі і В'етнама. Тут ёсць каханне і трагізм таго факту, што жыццё ў большай ступені ад нас не залежыць. У меладраматычнай пастаноўцы прысутнічае нейкая настальгія, хоць настальгія аб нечым дрэнным, што не вярнуць і не змяніць, — гэта складана, але так ці інакш можна адчуць атмасферу таго перыяду і прапусціць суперажыванне праз сябе. А жыццё герояў — не важна, якога гістарычнага перыяду і якой краіны — дазваляе гледачу супаставіць з імі самога сябе. Вельмі важна, калі працуе сэрца і ты не здольны не рэагаваць на тое, што адбываецца на сцэне. «Сайгон» можна назваць сямейным спектаклем — гэта вельмі прыгожая гісторыя з успамінамі аб тым, што сышло.



Пастаноўка «Арктыка».

***— Я ўжо не ўпершыню чую, што некаторыя пастаноўкі нельга прывезці на беларускую тэатральную сцэну нават не з-за фінансаў альбо лімітаваных тэхнічных магчымасцяў, а з-за непадрыхтаванасці публікі. Як гэта разумець?***

— Ёсць рэжысёры — я не буду агучваць іх імёны, — на якіх я гляджу і ўспамінаю, што Мінск — не тэатральны горад і некаторыя аўтары тут не пройдуць. Я бачу гэта і па тым, як раскупляюцца білеты. Наша публіка кансерватыўная, на што ўплываюць нагледжанасць, выхаванне і культура, якія не павінны спыняцца, бо мастацтва — жывое. Фестываль пройдзе восьмы раз, але 7—9 міжнародных пастановак у год — гэта кропля ў акіяне. Тэатр цікавы тым, што рэагуе на наваколле, таму без яго ты, атрымліваецца, адарваны ад рэальнасці. Наша ж рэальнасць такая, што ў Беларусі недастаткова пляцовак і спецыялістаў, якія ўмеюць працаваць з сучаснымі пастаноўкамі. А тое, што глядач не гатовы, я бачу, напрыклад, па тым, як ён успрымае Хайнэра Гёбельса і пытаецца: а што гэта было? Я памятаю Рамэа Кастэлучы ў Мінску і той рэзананс, які ён выклікаў. Там насамрэч не было нічога радыкальнага, а ўсё роўна выклікала ажыятаж. Тэатр, на пляцоўцы якога ставіўся Кастэлучы, казаў, што гэта бясконцы жах і мы не павінны такое паказваць. Прывыканне да свайго роднага прымушае думаць, што ўсё чужое — шкоднае, у чым і праблема нашага тэатральнага асяроддзя, якое прывыкла альбо плакаць, альбо нахвальваць адно аднаго.

***— Вас часам папракаюць тым, што беларуская праграма адасоблена ад міжнароднай.***

— І я адказваю, што ў іх розныя задачы. Пад невялікім фестывальным дахам мы хочам сабраць замежных гасцей-тэатралаў, якія маглі б пабачыць беларускі тэатр, і беларускую публіку, якой цікава паглядзець замежныя спектаклі. Так адбываецца важны тэатральны працэс, калі ўсе глядзяць і абмяркоўваюць. У беларускую праграму мы забіраем тое, што можа выклікаць цікавасць нагледжаных замежных гасцей, таму што не кожны гатовы ехаць сюды і марнаваць час. Наш тэатр, я не бяру добра вядомы Ляленчны, толькі на пачатку шляху, калі з'яўляюцца лідары, гатовыя выказацца.

***— Мне падаецца, для публікі ў стасунках з сучасным, незнаёмым, тэатрам ёсць некалькіх коўзкіх адхонаў і адзін з іх датычыцца таго, што пэўная частка гледачоў сапраўды не мае магчымасці падрыхтавацца да наватарскіх спектакляў і, калі прыходзіць на «ТЭАРТ», з-за агаломшанасці незвычайнасцю пастаноўкі можа страціць магчымасць яе ўспрыняць. Як глядзець новы тэатр?***

— Гэта сапраўды складана — тое самае, што непадрыхтаванаму гледачу глядзець балет: ён нічога не зразумее, расчаруецца і больш не прыйдзе. Калі на кінафестывалі «Лістапад» адбываецца дыялог і кінапаказы праходзяць на працягу года, то штогадовы міжнародны тэатральны фестываль у Мінску толькі адзін. Напэўна, нам сапраўды не хапае сустрэч і размоў пра сусветны тэатр, хоць іх, мне падаецца, для звычайных гледачоў будзе недастаткова. Бо, на жаль, у нас няма адпаведных прадметаў у школе ці інстытуце, практыкі сямейнага паходу ў тэатр. З той прычыны, што мы рэдка ходзім, і ўзнікае пытанне «а што гэта?». Вопыт успрымання не можа ўзнікнуць з ніадкуль, а ў той жа час страх, што ты нечага не зразумееш, перашкаджае набыванню білетаў. Я не магу агучыць нейкую формулу, па якой трэба глядзець сучасны тэатр, і сама шукаю адказ.

> **«Мне падалося важным паказаць розныя культуры ў танцы, абсалютна не падобныя адна на адну пастаноўкі, здольныя прынесці новыя адчуванні».**

***— «ТЭАРТ» у сілу сваёй эксклюзіўнасці становіцца ў пэўным сэнсе модным мерапрыемствам. Што па азначэнні можа прыцягнуць публіку, якая жадае далучыцца да моднага мерапрыемства, а не глядзець спектакль. Вы не заўважалі такіх рухаў?***

— Я не скажу, што мы модныя, мода мае тэндэнцыі і адведзены для іх час. Калі ты прыходзіш у нейкі тэатр і бачыш цікавы спектакль — гэта значыць, што ёсць людзі, якія хочуць пагаварыць на пэўную тэму, а ёсць тыя, хто прыходзіць з жаданнем гэта пачуць. Мне хацелася б, каб «ТЭАРТ» не станавіўся модным, маўляў, куплю дарагі білет і мяне заўважаць, а каб людзі адчувалі патрэбу ў дыялогу.

***— За колькі месяцаў да форуму вам трэба было дамаўляцца, каб запрасіць, напрыклад, вядомага фінскага рэжысёра Крысціяна Смэдса?***

— Увогуле праграму я раблю два гады, дамоўленасці па сёлетнім фестывалі пачала заключаць з пачатку 2017 года. Тут трэба не проста дамовіцца, але і знайсці магчымасць прывезці пэўны тэатр. Фестываль адбываецца, калі зацікаўлены абодва бакі — не толькі той, хто запрашае, але і той, хто прыязджае і хоча адчуць іншую аўдыторыю і яе рэакцыю. Наш глядач рэальна інакш рэагуе. Калі пасля нейкага фестывалю я гляджу тую ж пастаноўку ў Мінску, думаю, чаму ніхто не пляскае ў далоні, не раскрываецца і чакае, хто засмяецца першым. У нашага гледача ёсць пэўная сканаванасць, і за гэтым цікава назіраць.

***— Калектывы, што да нас прыязджаюць, дзеляцца ўражаннямі ад нашай публікі?***

— Памятаю, калі мы прывозілі, здавалася б, ментальна зразумелы рускамоўны спектакль «Жыццё і лёс» з Санкт-Пецярбурга, мне сказалі, што наша публіка рэагуе як у Японіі: яна непрадказальная і там, дзе патрэбна рэакцыя, чуецца цішыня. Я ўжо не кажу пра калектывы з больш аддаленых краін, для якіх прыезд у Беларусь — зусім новы вопыт.

***— У беларускай праграме два спектаклі «Арт Карпарэйшн» — «Крыжовыпаходдзяцей» і «З вучылішча». Мне ў гэтым бачыцца канфлікт інтарэсаў.***

— Куратарам праграмы «Belarus Open» з'яўляецца Людміла Грамыка, і я ёй шчыра сказала, што нічога лабіраваць не буду, бо не хачу сябе зняславіць. Таму калі яна лічыць неабходным, то ўключае ў праграму нашы пастаноўкі. Але, дзякуй богу, мая інтуіцыя чалавека, што займаецца тэатрам, дае вынік, які мы можам прэзентаваць гасцям. «Крыжовыпаходдзяцей» Юрыя Дзівакова не быў прыняты гледачом так, як нашумелая пастаноўка «З вучылішча». Хоць Дзівакоў мне падаецца недаацэненым, ён вельмі таленавіты і унікальны аўтар. Магчыма, публіка не зусім гатова да такой перфарматыўнасці і шчырасці, але яго спектакль ні на што не падобны. Я амаль не ўмешваюся ў беларускую праграму, а часам нават сама адкрываю для сябе новыя імёны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

# НОВЫЯ ГЕРОІ ДЛЯ НАРОДНАГА ПЕСНЯРА

**Легендарны дзед Талаш, услаўлены Якубам Коласам у аповесці «Дрыгва», не ведаў, якія казачныя скарбы хавае яго петрыкаўская зямля. Народны герой Беларусі, актыўны ўдзельнік партызанскага руху ў гады белапольскай акупацыі і Вялікай Айчыннай вайны проста па-геройску бараніў свой край ад захопнікаў. Ужо ў нашы часы на Петрыкаўшчыне адкрыты велізарныя запасы калійнай солі, і сёння тут разгортваецца гіганцкая будоўля — узводзіцца горна-ўзбагачальны камбінат. У цэнтры падзей добра знаёмы чытачам нашай газеты калектыў ААТ «Трэст Шахтаспецбуд», са справамі якога мы імкнёмся знаёміць пастаянна. У перадсвяточным інтэрв'ю на пытанні «Звязды» адказваюць кіраўнікі трэста. Чаму перадсвяточным? У гэтыя дні Салігорск, дзе базіруецца трэст і ў развіццё якога ўносяць немалы ўклад, і яго буйнейшае градаўтваральнае прадпрыемства ААТ «Беларуськалій» адзначаюць сваё 60-годдзе.**



**Скульптурная кампазіцыя каля ўвахода ў галоўны будынак ААТ «Трэст Шахтаспецбуд» у гонар беларускіх гарнякоў.**

## ЗАДАЧА НУМАР АДЗІН

Слова старшыні савета дырэктараў трэста, кандыдату тэхнічных навук **Валерыю СТАРЦАВУ.**



***— Паспрабуем з вашай дапамогай, Валерый Мікалаевіч, сфармуляваць задачу нумар адзін для калектыву на сённяшні дзень. Калі не памыляемся, Петрыкаў?***

— Вы не памыляецеся, безумоўна, Петрыкаў. І гэта нават не проста задача, а стратэгічная задача. Падчас мінулай нашай сустрэчы я расказваў вам, што трэст выйграў тэндар на будаўніцтва шахты — вертыкальных стваолаў, падземнай часткі і паверхневых работ. Так што ў Петрыкаве будзем выконваць велізарны аб'ём усіх работ.

Работы ўжо вядуцца, ажыццяўляецца праходка двух ствалоў — скіпавага і грузавога, для перамяшчэння грузаў і людзей, аж пакуль выконвае і функцыю вентыляцыйнага. З цягам часу будзе і трэці, чыста вентыляцыйны.

Прыродаахоўныя мерапрыемствы ў асноўным выконваем таксама мы. Ужо ўзвялі, у прыватнасці, солеадвал, а аб'ект складаны. Наша задача — каб не прасочваліся расолы. Выканалі і абсалютна новую для сябе работу — забівалі велізарную колькасць буранабіўных паляў. Закупілі для гэтага спецыяльнае абсталяванне, якое дазволіла за кароткі тэрмін на былым балоце выконваць любыя па складанасці работы з найвышэйшай якасцю. Зараз займаемся шламасховішчам.

На Петрыкаўскім ГУКу працуе і наша новае горна-шахтавае абсталяванне, частку яго (пад'ёмныя машыны) закупіў «Беларуськалій». Шмат чаго вырабілі самі: і секцыйную апалубку для ўкладкі бетону, і рабочыя палкі (пляцоўкі), шківы, капры...

Завершыць вертыкальныя ствалы мы павінны ў наступным годзе, 250 метраў яшчэ патрэбна ісці. Недзе на глыбіні 800—810 метраў адбудзецца наша сустрэча з калійным гарызонтам, і пачнём займацца гарызантальнымі работамі. Там праходчыкі — хто на камбайнах, хто бура-ўзрыўным спосабам — прыступяць да выпрацоўкі каляствольнага двара, камер вялікага сячэння. І зоймуцца выпрацоўкай галоўных кірункаў, а далей — панельнымі выпрацоўкамі, каб манціраваць абсталяванне для выемкі карысных выкапняў.

Варта мець на ўвазе, што ў Беларусі раней мы будавалі толькі руднікі, а тут, у Петрыкаве, пачалося ўзвядзенне горна-ўзбагачальнага камбіната з усёй інфраструктурай, дзе будзе поўны закончаны вытворчы цыкл: здабыча, пад'ём карыснага выкапня з зямлі, абагачэнне і адпраўка спажыўцам. Якасць руды — прыкладна ад 25 да 32 працэнтаў карыснага рэчыва. І самае галоўнае — там вялікія яе залежы, некалькі прадукцыйных пластоў.

***— І ўсё ж, у чым складанасці новабудоўлі ў Петрыкаве?***

— Галоўная складанасць заключаецца ў тым, што радовішча вельмі моцна абводненае, і абводненасць дасягае глыбіні 500 метраў. Балоцістая мясцовасць (раней тут былі ведаеце якія балоты! Хоць яны і асушаны за савецкія часы) і буйная рака Прыпяць побач. Спатрэбілася выконваць спецыяльныя гідратэхнічныя мерапрыемствы па паніжэнні ўзроўню вады. Пры праходцы вертыкальных стваолаў давялося замарожваць гэтыя пароды. І прыняжыць трохслойнае мацаванне (ахову) — перадавы бетон, чыгунныя цюбінгі і гідраізаляцыйны матэрыял, каб вада не трапіла ў ствол. Бо для любой калійнай шахты гэта фініш. Чым тлумачыцца і вялікі аб'ём тампанажных работ. Сёння мы адзіныя ў свеце, каму даводзіцца выконваць такія аб'ёмы ахоўных мерапрыемстваў і хто іх выконвае з такой акуратнасцю, пільнасцю і такой якасцю. Затое колькі ствалоў ні рабілі, ніводзін не працёк. Гэта вялікая заслуга інжынерна-тэхнічных работнікаў, рабочых, усяго калектыву. Мы ганарымся сваімі праходчыкамі, яны зараз спаборнічаюць паміж сабой на ствалах, абедзве брыгады працуюць высокаэфектыўна, маем права імі ганарыцца.

Сёння трэстам назапашаны сур'ёзны вопыт у праходцы вертыкальных стваолаў, і нейкіх непераадольных перашкод няма. Калі раней рэкордныя лічыліся 40—45 метраў праходкі ў месяц, то зараз 60 — гэта планавыя, а рэкорд — калі 80.

***— Вы закранулі тэму якасці. Ваш калектыў славіцца менавіта такім узроўнем работ. Чым дабіваецеся высокай якасці?***

— У першую чаргу такі ўзровень забяспечваю падрыхтаваны персанал, пачынаючы ад рабочага і інжынерна-тэхнічных работнікаў і далей. Наша школа складвалася гадамі. За ёю стаіць вялікая карпатлівая работа.

Сфарміравалі высокапрафесійны аддзел якасці, які сочыць за кандыцыйнасцю бетону, металаканструкцый, самімі работамі. Смела можна сказаць, што гэта людзі, якія вызначаюць якасць нашага жыцця. Рэкламацыі з боку заказчыка, калі яны здараюцца, выклікаюць самыя жорсткія разборкі. А за высокую якасць работ прэміруем, і гэта сур'ёзна стымулюе працу і дзейнічае нават лепш, чым спаганнені.

***— Акрамя Петрыкава ў вас вялікі аб'ём работы на аб'ектах «Беларуськалія»?***

— На калійным гіганце сканцэнтравана амаль 98 працэнтаў аб'ёмаў нашых работ. У апошнія гады «Беларуськалій», можна сказаць, заваяваў сусветны рынак калійных угнаенняў. Узраслі аб'ёмы продажу, а каб атрымаць больш за 10 мільёнаў тон угнаенняў для пастаўкі за мяжу, патрэбна перапрацаваць 50—55 мільёнаў тон руды. І яны засяродзілі сваю ўвагу на галоўным. Раней яны самі рыхтавалі шахтавыя палі, зараз гэта даручана нам.



Панарама будоўлі Петрыкаўскага ГУКа.

З найбольш заўважнага, што зроблена намі апошнім часам дома, — праход праз тэктанічны разлом на Чырвонаслабодскім рудніку. Гэта было не толькі складана, але і небяспечна. Кансультавалі навукоўцы з інстытута «Белгархімпрам» з удзелам навукоўцаў «Беларуськалія».

***— Пракаментуйце, калі ласка, інфармацыю аб будаўніцтве ў перспектыве Дарасінскага рудніка.***

— Зараз «Беларуськаліем» разглядаецца пытанне аб узвядзенні Дарасінскага рудніка для падтрымання руднай базы трэцяга рудаўпраўлення. Аб'ём вытворчасці ў «Беларуськалія» вельмі высокі, і рудная база дастаткова хутка выпрацоўваецца. І менавіта Дарасінскі руднік прадоўжыць жыццё трэцяга рудаўпраўлення яшчэ мінімум на 30—35 гадоў.

***— Валерый Мікалаевіч, але ў Беларусі рэалізуецца яшчэ адзін значны праект — расійскай кампаніяй «Слаўкалій». Гэта будаўніцтва горна-ўзбагачальнага камбіната на Нежынскім радовішчы калійных соляў. Чаму вы не ўдзельнічаеце ў яго ўзвядзенні?***

— Так, гэта дзіўна і для нас. Мы — беларускае прадпрыемства, з сусветным іменем, але нас нават на апошні тэндар не запрасілі. Вынікі яго таксама збянтэжылі — выйграў нямецкі машынабудаўнічы канцэрн Herrenknecht сумесна з кампаніяй «Дайльман Ханіэль», якія будуць весці работы на нашай зямлі. І гэта пры наяўнасці сваёй, беларускай кампаніі, якая мае велізарны вопыт работы пры будаўніцтве вертыкальных стваолаў у найскладанейшых горна- і гідрагеалагічных умовах. З улікам таго, што мы ведаем мясцовыя ўмовы і маем у наяўнасці ўласную рабочую сілу, мы выконвалі б работы танней і больш якасна.

Што ж робяць гэтыя нямецкія кампаніі, не маючы ўласнага абучанага персаналу? Яны проста пераманьваюць інжынерна-тэхнічны і рабочы персанал ААТ «Беларуськалій» і ААТ «Трэст Шахтаспецбуд», прапануючы нечуваныя зарплаты. Што дэстабілізуе работу ў нашых калектывах. І гэта няправільна. У сябе ў краіне мы павінны будаваць самі, тым больш што мы ўжо даказалі сваю здольнасць выконваць работы любой складанасці.

***— Сталіца шахцёрскага краю адзначае юбілей...***

— У рамках падрыхтоўкі да юбілею мы прынялі матэрыяльны ўдзел у мерапрыемствах па добраўпарадкаванні горада, а таксама ў адкрыцці трох мемарыяльных дошак. Адкрываем барэльеф і дошку першаму на Салігоршчыне Герою Сацыялістычнай Працы А. В. Селіванаву — чалавеку, які пабудаваў шаснаццаць шахтавых ствалоў. І памятную дошку з барэльефам беларускаму савецкаму пісьменніку Аляксею Кулакоўскаму, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР, нашаму земляку — ён родам з вёскі Кулакі Салігорскага раёна.

А на Алеі Славы раёна — барэльеф ветэрана-калійшчыка А. І. Дзіуліна, дзеда нашага генеральнага дырэктара. Ён узнагароджаны ордэнамі салдацкай Славы трох ступеняў, што прыраўноўваецца да звання Героя Савецкага Саюза.

Паставілі прыгожы помнік шахцёрам перад уваходам у галоўны офіс трэста, рабілі яго самі, на дачным прадпрыемстве.

***— Як вы асабіста ўспрынялі прысваенне ганаровага звання «Заслужаны шахцёр Беларусі»?***

— Кіраўніку дзяржавы, калі ён уручаў мне ганаровы знак, сказаў: «Аляксандр Рыгоравіч, дзякуй за павагу да шахцёрскай працы». Ён быў на рудніках «Беларуськалія», спускаўся ў шахту і ведае цану працы шахцёра.

Што я магу яшчэ сказаць? Мне зараз 63 гады. І калі так кіраўнік дзяржавы ацаніў мае заслугі, значыць, свой уклад у развіццё горнай галіны краіны я ўнёс.

***— Ваш калектыў таксама развіваецца?***

— Амаль тры гады назад, калі мы з вамі сустракаліся, у нас было 1500—1550 чалавек. Сёння ўжо 2400. Развіваемся і колькасна, і якасна. На працу прымаем у асноўным спецыялістаў.

***— Вы яшчэ і старшыня савета валейбольнага клуба «Шахцер».***

— У наступным годзе клубу споўніцца 20 гадоў. З таго часу, як я пачаў займацца яго справамі, клуб чатыры разы быў бронзавым прызёрам, тры разы сярэбраным прызёрам і два апошнія гады заваёўваў залатыя медалі на чэмпіянатах Рэспублікі Беларусь. Збіраемся і сёлета змагацца за залатыя медалі. У нас задача — выйграць кубак краіны.

### Мовай лічбаў

***Сваю дзейнасць калектыў пачаў у 1977 годзе, і за гэты час пройдзены гарызантальныя горныя выпрацоўкі агульнай працягласцю 2500 км.***

***Пабудавана шэсць вертыкальных стваолаў агульнай глыбінёй 3278,5 метра.***

***Змантыраваны канвеерныя лініі агульнай працягласцю больш за 200 км.***

***Дасягнуты рэкордныя тэмпы праходкі вертыкальнага ствала — 81 м/месяц.***

***Забяспечана рэкордная дакладнасць збойкі горных выпрацовак з вертыкальнымі ствалами пры аддаленні іх адзін ад аднаго на 12 км (сустрэчная праходка, Бярозаўскі руднік) — не больш за 5 см.***



**Ускрыты чацвёрты калійны гарызонт другога рудаўпраўлення. Злева направа: намеснік генеральнага дырэктара М. М. СКРЫПНІК, галоўны інжынер трэста А. А. ЗУБАЎ, генеральны дырэктар Д. А. ДЗІУЛІН.**



**Удзельнікі падзеі — машыніст горных выемачных машын Арцём КАСТЭНКА і горнарабочы Аляксей ЛІХАЧОЎ.**

***Прадстаўляем калектыў***

***ААТ «Трэст Шахтаспецбуд» — адно з нямногіх у свеце прадпрыемстваў, якія выконваюць унікальныя па сваёй складанасці работы, што не маюць аналагаў па аб'ёмах і канструкцыйных рашэннях. Ажыццяўляе будаўніцтва аб'ектаў прамысловага і грамадзянскага прызначэння, уключаючы праходку вертыкальных шахтавых ствалоў і гарызантальных горных выпрацовак у складаных горна-геалагічных умовах. А таксама будаўніцтва, абслугоўванне і рамонт аб'ектаў прамысловага і грамадзянскага прызначэння. Узводзіць аб'екты капітальнага будаўніцтва і земляныя інжынерныя збудаванні, пракладвае дарогі, манціруе трубаправоды і тэхналагічнае абсталяванне.***

***На постсавецкай прасторы з'яўляецца лідарам па ўзвядзенні шахтавых ствалоў спецыяльным спосабам. За плячыма калектыву — якасна пройдзеныя ствалы: па два на Чырвонаслабодскім і Бярозаўскім рудніках, столькі ж у туркменскім Гарлыку. І вядзецца праходка двух ствалоў на Петрыкаўскім ГУКу.***

***За мяжой складаныя тэхналагічныя праекты рэалізаваны трэстам у Расіі, Украіне, Латвіі, Туркменістане. У Беларусі з яго ўдзелам пабудаваны ўсе прадпрыемствы горназдабываючага комплексу.***

# СЛОВА СВАЁ ТРЫМАЕМ

**Генеральны дырэктар трэста Дзяніс ДЗІУЛІН** вярнуўся з нарады ў райвыканкаме, прысвечанай юбілею горада, і далучыўся да размовы. Расказваючы пра надзённае, Дзяніс Аляксандравіч палічыў неабходным успомніць і пра экспарт паслуг. Прызнаёмся: тое, што ён паведаміў, было для нас новай інфармацыяй.



— Развіваючы экспарт сваіх паслуг, заключылі ў Мурманскай вобласці кантракт на супрацоўніцтва з Кіраўскім філіялам ФОСАГРА АТ «Апатыт». Разумеем, што гэта не толькі валюта ў краіну, але яшчэ і імідж фірмы, і новы вопыт для кадраў. Прадпрыемства вельмі сур'ёзнае, такое ж, як і «Беларуськалій». Раней на Кольскім паўвостраве ў нас было сваё шахтабудаўнічае ўпраўленне, добрая слава пра нас засталася. І калі знакаміты «Апатыт» звярнуўся з просьбай дапамагчы, згадзіліся, нават адкрылі свой філіял. Да нас прыязджалі іх кіраўнікі, пазнаёміліся з нашымі магчымасцямі, пабывалі на рудніку «Беларуськалія» і будаўніцтве Петрыкаўскага ГУКа.

У выніку ў нас на «Апатыце» — падрад на горныя работы: выступаем генпадрадчыкам па падземным будаўніцтве і рамонце. Робім драбільны комплекс, які дазволіць на 30 працэнтаў павялічыць магутнасць іх Кіраўскага рудніка. І ў перспектыве новы кантракт з імі — па замене арміроўкі ствалоў, камунікацый у ствалах і капрах. Сёння яны пашыраюць распрацоўку радовішча і прапануюць нам таксама паўдзельнічаць у будаўніцтве двухруднікоў і выкананні некаторых іншых сур'ёзных доўгатэрміновых праектаў. Там дастаткова цвёрдыя пароды, затое адсутнічае водапрыток, што аблягчае задачу.

***— Вернемся да спраў дамашніх. Дзяніс Аляксандравіч, ці адрозніваецца Петрыкаў ад усяго, што было раней?***

— Адрозніваецца перш за ўсё дыяметрам сваіх ствалоў. Усе ствалы, якія пабудаваны ў Салігорску, маюць дыяметр 7 метраў. У Петрыкаве — 8, каб павялічыць памеры пад'ёмнага абсталявання і наогул прадукцыйнасць ствалоў. Трактар МТЗ-80 заязджае ў клець без разборкі і адразу трапляе ў забой.

Другое адрозненне — глыбіня. Такіх глыбокіх ствалоў на Старобінскім радовішчы яшчэ не было — больш за 800 метраў.

Спосабам праходкі. Пра гэта скажу крышку ніжэй.

І адрозніваюцца цюбінгавыя калоны: іх памеры не 300, а 500 метраў, бо больш магутныя ваданосныя пласты. Пры праходцы яны замарожваюцца, а ўжо потым устанаўліваюцца цюбінгавыя калоны. А паколькі дыяметр ствалоў большы, то большая колькасць замарожваючых свідравін — ад 30 да 40.

***— У адным сваім інтэрв'ю пра Петрыкаў вы сказалі: «Мы зробім усё, каб з першых крокаў гэта была самая сучасная будоўля. Пакажам самае лепшае, што ўмеем. І з пункту гледжання тэхналогій, і па стварэнні ўсіх магчымых спрыяльных умоў працы». Атрымліваецца?***

— Калі паабяцалі, то абавязкова атрымаецца. Для пачатку мы пабілі ўласны рэкорд: калі раней рабілі 61,5 метра праходкі ствала сяміметровага дыяметра, то на гэты раз у складаных горных і гідралагічных умовах прайшлі 81 метр. Калі прыраўнаваць да ствала ранейшага дыяметра, то наогул атрымаецца 104 метры. Паказалі сапраўднае майстэрства, прадэманстраваўшы высокія тэмпы і якасць праходкі.

У Петрыкаве адразу далі сябе адчуць праблемы прыроднага характару: пайшлі водапатокі да 2500 кубоў у гадзіну, і давялося закрывацца цюбінгамі. Да гэтага работы вяліся цыклічна: праходка, бетон, а ўжо потым цюбінгі. Зараз мы выконваем работы паралельна: вядзецца праходка і адначасова тампанаж з прымяненнем цюбінгаў. Атрымалі магчымасць адначасова рабіць і праходку, і мантаж. Гэта ўжо іншая складанасць і іншы клас работы. На новы ўзровень дазволілі выйсці напрацаваны вопыт і зладжанасць калектыву.

У нас вельмі моцная інжынерная служба, мае досвед праходкі не толькі вертыкальнай, але і гарызантальнай.



Вядучы інжынер аддзела кантролю якасці Марына ЛАПАТКО змяшчае ўзоры будаўнічых матэрыялаў у камеру з мікракліматам.

Вы ўжо ведаеце, што гэтымі днямі намі ўскрыты чацвёрты гарызонт другога рудніка, які дазволіць прадоўжыць яго жыццё да 20 гадоў. А гэта сапраўдны падарунак для эканомікі краіны. Раней такога не было: не хапала сродкаў ці тэхнічных магчымасцяў, і на ўсіх рудніках аб'яднання вялася распрацоўка другога і трэцяга гарызонтаў, найбольш багатых на карысныя выкапні. А першы і чацверты пакідалі «на потым». Зараз час прыйшоў, «Беларуськалій» даверыў нам гэтую работу, і мы не падвялі. Чакаюць сваёй чаргі чацвёртыя гарызонты з нядрэннай якасцю руды і на другіх рудніках. Значыць, будзе работа ва ўзбагачальнай фабрыкі.



На ўчастку вытворчасці, дзе вырабляюць металаканструкцыі горна-шахтавага абсталявання.

Задача на перспектыву — ускрыццё першага калійнага гарызонту. Праект разглядаецца, вядзецца геалагічная разведка.

Мы наогул удзельнічаем ва ўсіх знакавых падзеях жыцця «Беларуськалія». Суровую школу Гарлыка таксама прайшлі разам.

***— Салігорск для вас — гэта толькі месца, дзе знаходзіцца ваша асноўная вытворчая база, «спальны раён», ці нешта іншае?***

— Мае бацькі прыехалі сюды разам са сваімі бацькамі на камсамольскую будоўлю. Яны тут вучыліся, пазнаёміліся, стварылі сям'ю, тут я нарадзіўся. У Салігорску закончыў школу і вучылішча, застаўся працаваць. У мяне адзіны запіс у працоўнай кніжцы — ААТ «Трэст Шахтаспецбуд», якому аддаў 22 гады. А наш трэст — другое градаўтваральнае прадпрыемства пасля ААТ «Беларуськалій», другі па аб'ёмах падаткаплацельшчык. Для мяне гэта ўсё непадзельнае: горад Салігорск, два яго буйнейшыя прадпрыемствы і маё жыццё. Лічу, што мне пашанцавала — удзельнічаць у найбуйнейшых падзеях рэгіёна, такіх як узвядзенне новых руднікоў, ускрыццё новых гарызонтаў. І сустрэць юбілей роднага горада.



Матарыст бетоназмяшальнай устаноўкі Аляксандра ЧЭРАВАКА за пультам кіравання тэхналагічнымі працэсамі.

Шчыра віншую жыхароў Салігорска з юбілеем і Днем шахцера. Асаблівыя мае віншаванні ўсім работнікам партнёрскага калектыву «Беларуськалія», персанальна генеральнаму дырэктару Івану Іванавічу Галаватаму. Беларускай калійнай кампаніі ў асобе генеральнага дырэктара Алены Аляксандраўны Кудравец. Усё, што летась напрацавалі салігорскія шахцёры для продажу за мяжой, БКК паспяхова рэалізавала.

Не абышлося і без нашага ўдзелу. Каб не паўтараць вядомыя факты, назаву толькі адзін: сёння ў забоях побач з тэхнікай «Беларуськалія» працуюць 16 нашых праходчых камбайнаў. Таму з асаблівым задавальненнем віншую са святам і ўласны калектыў, які заслугоўвае самых цёплых слоў, і ўсе партнёрскія арганізацыі шахцёрскай сталіцы. І жадаю ўсім шахцёрскага здароўя, агульначалавечага шчасця, далейшых поспехаў.

І хачу пажадаць жыхарам Салігорска нараджаць больш дзетак, каб было каму пакінуць такую багатую спадчыну.

x x x

Як бачым, новы час называе імёны новых герояў. Калі б народны пясняр з'явіўся нашым сучаснікам, жыў сярод нас, у яго быў бы шыкоўны выбар.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**
**і з архіва прадпрыемства.**

УНП 600122529



Работнікі праходчай брыгады Д. ГРАБЯНЬКА, якая на ўзвядзенні Петрыкаўскага ГУКа дасягнула рэкордных тэмпаў праходкі ў восемдзесят пагонных метраў гатовага ствала ў месяц.

■ Уступная кампанія — 2018

# ЗРАБІЦЬ ЗАЧЫН НА ЗАЎТРА

## Ад работніка да спецыяліста з вышэйшай адукацыяй

**Скончыўся прыём ва ўстановы прафесійнай адукацыі. Нягледзячы на тое, што колькасць месцаў у сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных установах у гэтым годзе была павялічана, планы па наборы аказаліся выкананы.**



Фота БелТА.

### У пашане медыкі і айцішнікі

У сярэднія спецыяльныя ўстановы паступалі хлопцы і дзяўчаты з нядрэннымі атэстатамі, прахадныя балы былі даволі высокія. Як заўсёды, асабліва былі запатрабаваныя медыцынскія, педагагічныя, юрыдычныя, эканамічныя спецыяльнасці. Таксама ахвотна абітурыенты выбіралі прафесіі, звязаныя з будоўляй, архітэктурай, энергетыкай, транспартам. Вялікія конкурсы былі сярод будучых «айцішнікаў». Нават на платныя месцы такіх навучальных устаноў абітурыенты ішлі даволі актыўна. У гэтым годзе (як, дарэчы, і ў папярэднім) праблемы з запаўненнем адчуваліся толькі на спецыяльнасцях лёгкай прамысловасці і заатэхніі.

— Падрыхтоўка будзе весціся па 151 спецыяльнасці сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Сярод новых прапаноў для абітурыентаў — «візуальны мерчэндайзінг», «захаванне і перапрацоўка збожжа», па жаданні заказчыка аднаўляецца спецыяльнасць «сацыяльная работа», а таксама паступіў заказ на спецыялістаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, — паведаміла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення, начальнік упраўлення прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Марына СУВОРАВА.** — У гэтым годзе мы крыху перагледзелі структуру падрыхтоўкі, павялічылі прыём на тэхналагічныя і тэхнічныя спецыяльнасці на пяць працэнтаў, будаўнічыя — на шэсць працэнтаў, а на кіраўнічыя і правазнаўчыя, наадварот, на тры працэнты знізілі.

20 жніўня скончыўся прыём і ў прафесіянальна-тэхнічныя ўстановы, да 25 жніўня яшчэ ідзе залічэнне абітурыентаў. Але ўжо сёння можна сказаць, што план па наборы абітурыентаў будзе выкананы на 99 працэнтаў — гэта пры тым, што сёлета ПТВ гатовыя ўзяць на 1,3 тысячы навучэнцаў болей. Правіламі прыёму прадугледжана, што тэхнічныя навучальныя ўстановы, у якіх засталіся вакантныя месцы на асобныя спецыяльнасці, могуць працягнуць прыём да 15 верасня. Звычайна такую магчымасць выкарыстоўваюць установы будаўнічага профілю, сельскай гаспадаркі і лёгкай прамысловасці.

Калі ў мінулым годзе ў Беларусі было 113 каледжаў, сёлета іх стала 111, колькасць устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі таксама скарацілася — на тры адзінкі (да 131). Але гэта не азначае, што менш хлопцаў і дзяўчат змогуць атрымліваць рабочыя прафесіі. Справа ў тым, што навучальныя ўстановы, блізкія па ўзроўнях падрыхтоўкі, аб'ядноўваюцца, утвараюць кластары.

### Шлях да мары

Да таго ж пастановай урада ўведзена прафесійная падрыхтоўка школьнікаў 10—11 класаў у межах навучальнага прадмета «працоўнае навучанне». Для гэтай справы будуць задзейнічаны як школьныя майстэрні, так і база ўстаноў прафесійнай адукацыі. Знаёміцца з прафесіямі будуць падлеткі, якія не вучацца ў профільных класах. Пасля заканчэння праграмы хлопцаў і дзяўчат чакае экзамен з прысваеннем кваліфікацыі. На сумесных мерапрыемствах школ і ўстаноў прафесійнага навучання старшакласнікі не проста атрымліваюць інфармацыю — для іх адкрываюцца майстэрні, праводзяцца майстар-класы, хлопцы і дзяўчаты спрабуюць рабіць нешта сваімі рукамі. У выніку многія пасля выбіраюць прафесійнае навучанне, тым больш што такое рашэнне зусім не пазбаўляе іх мары аб вышэйшай адукацыі, хутчэй наадварот.

— У нас у краіне дастаткова шырокі дыяпазон траекторый атрымання адукацыі. Можна ісці праз прафесіянальна-тэхнічную адукацыю, пасля паступаць на скарочаны тэрмін у сярэднія спецыяльныя ўстановы, і далей — інтэграцыі сярэдняй адукацыі з вышэйшай. Гэта сістэма пабудаваная, і яна сёння працуе, — заўважае Марына Суворава. — Але можна выбіраць і іншыя шляхі: адразу паступаць ва ўстановы вышэйшай адукацыі, ці, калі ўжо мае прафесію, павышаць кваліфікацыю непасрэдна на рабочым месцы.

Як правіла, скарочаныя формы навучання прапануюць ВНУ, у структуры якіх ёсць каледжы. І не трэба думаць, што інтэгруюцца толькі спецыяльнасці з аднолькавымі назвамі. Так, аднаму з кірункаў, на які паступаюць у ВНУ, можа адпавядаць з дзясятак спецыяльнасцяў сярэдняй адукацыі.

Акрамя таго, часта маладыя людзі самі выбудоўваюць навучанне так, каб атрымаць разнастайныя веды. Напрыклад, кухары ці аўтамеханікі выбіраюць для навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі эканамічны і юрыдычны профіль, каб адкрыць уласную справу. Не будзем забывацца, што існуюць пералікі спецыяльнасцяў, атрыманых у выніку прафесійнага навучання, якія даюць правы паступаць на вячэрнюю ці завочную форму навучання за бюджэтныя сродкі.

Умовы прыёму, якія ўстаноўлены ў 2017 годзе, прадугледжваюць, што працягваць адукацыю могуць не толькі ўчарашнія школьнікі, але і маладыя людзі, якія ўжо маюць прафесію. Прычым ім не трэба здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне.

### Новы змест

Трэба сказаць, што навучальныя праграмы ўстаноў прафесійнай адукацыі сёння моцна змяніліся.

— Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны ўведзена на рынку такое паняцце, як прафесійны стандарт: для яго характэрна больш падрабязнае апісанне патрабаванняў да канкрэтнага работніка. Гэтыя прафесійныя стандарты будуць складацца сектаральнымі саветамі, якія ствараюцца пры галіновых міністэрствах і ведамствах і датычацца пэўнай сферы. Пры міністэрстве эканомікі, дарэчы, сектаральныя саветы ўжо створаныя, вядзецца праца па абнаўленні патрабаванняў работадаўцаў да канкрэтных работнікаў. Натуральна, задача сістэмы адукацыі — своечасова зрэагаваць на гэтыя патрабаванні абнаўленнем зместу праграм. Але гэта працэс дастаткова фундаментальны і доўгі, — расказвае **начальнік цэнтра навукова-метадычнага забеспячэння прафесійнай адукацыі Рэспубліканскага інстытута прафесійнага навучання Аляксандра ПЯТРОВА.**

Нельга забывацца і на міжнародныя прафесійныя стандарты, каб на нашых прадпрыемствах спецыялісты маглі працаваць з сучасным абсталяваннем і валодаць такімі ж навыкамі, як і замежныя работнікі. У 2014 годзе Беларусь далучылася да WorldSkills — міжнароднага руху, якія аб'ядноўвае ўстановы адукацыі, работадаўцаў і наогул моладзь, якая не толькі атрымлівае прафесійнае навучанне, але ўжо працуе па сваёй спецыяльнасці. Каб беларускія хлопцы і дзяўчаты змаглі на належным узроўні паказваць сябе на міжнародных спаборніцтвах прафесійнага майстэрства, навучальныя ўстановы пераглядаюць праграму падрыхтоўкі. Прычым да гэтай справы падключаюцца ў тым ліку і работнікі рэальнага сектара, якія валодаюць ведамі аб новых тэхналогіях і абсталяванні.

Для таго каб рыхтаваць сучасных спецыялістаў, у краіне ствараюцца рэсурсныя цэнтры. Прычым цэнтралізаванае аснашчэнне матэрыяльна-тэхнічных баз пэўных устаноў вядзецца па ўсіх рэгіёнах. Калі ў сваіх вучэбных майстэрнях навучэнцы могуць знаёміцца са стандартным абсталяваннем, то такія цэнтры — гэта канцэнтрацыя інавацыйных і высокатэхналагічных рэсурсаў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

# КАБ НЕ СТАЯЦЬ У ЧАРЗЕ Ў ПАЛІКЛІНІЦЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З гэтым планам параілі звярнуцца ў рэгістратуру, дзе мусяць выдаць талоны да патрэбных нам спецыялістаў. Рабіць гэта неадкладна мы, трэба прызнацца, не сталі — паехалі ў адпачынак, пра што потым ледзь не пашкадавалі. У канцы жніўня, калі вырашылі завяршыць пачатае, у паліклініцы па колькасці дзяцей і іх бацькоў адчувалася, што пра даведкі да школы раптам успомнілі ўсе адразу. Да 3-й паліклінікі «прыпісаны» дзеці і падлеткі аж трох раёнаў Мінска: Кастрычніцкага, часткі Ленінскага і часткі Маскоўскага — яна абслугоўвае больш за 17 тысяч юных мінчан. І амаль усе з іх, акрамя зусім малых, з 1 верасня мусяць адправіцца на заняткі ў школы ці дашкольныя ўстановы.

**«Найчасцей у сённяшніх школьнікаў выяўляюцца хваробы апорна-рухальнага апарату, у прыватнасці скаліёз, а таксама афтальмалагічныя і стаматалагічныя захворванні».**

Атрымаўшы ў рэгістратуры талончык на прафілактычны агляд да стаматолага, вырашылі паспрабаваць прайсці ў той жа дзень і ўсіх астатніх. Праўда, упэўненасці ў поспеху задумкі ўсё ж не было. У паліклініку прыйшлі ў 9 гадзін раніцы. У 10 — запіс да стаматолага, за гадзіну можна паспрабаваць здаць кроў. Праўда, чарга перад кабінетам аптымізму не дадае: дзеці, бацькі, цэлыя сем'і — спрагназаваць, хто з іх на працэдуру, а хто — у «групе падтрымкі», няпроста. Праўда, і сачыць за чаргой з надаўняга часу няма сэнсу: электронны талончык вызначае твой нумар у чарзе. Рухаецца яна хутка, нягледзячы нават на тое, што сама працэдура для дзяцей даволі нервовая і патрабуе ад медработнікаў шэрагу дыпламатычных навыкаў у кантактаванні з маленькімі пацыентамі. Нам гэту працэдуру аблягчае ланцэт, які робіць працэс небалючым (яго загадзя набылі ў аптэчным кіёску).

Аналізы здадзены, а да наведвання стаматолага застаецца яшчэ паўгадзіны, таму вырашаем зрабіць кардыяграму. Тут прыём ідзе па жывой чарзе, але перад кабінетам усяго пару чалавек — ёсць надзея, што паспеем. Пятнаццаць хвілін — і мы ідзём да стаматолага. Пільны агляд, парада не забываць пра назначэнні ўрача-артадонта, якога мы перыядычна наведваем, — і мы на фінішнай прамой. Застаўся скрынінгавы кабінет.

Вялікай чаргі тут таксама не назіраецца, праўда, пачакаць усё ж давядзіцца: кожнаму юнаму пацыенту вымяраюць рост і вагу, а таксама артэрыяльны ціск, правяраюць зрок, слых, магчымыя парушэнні паставы. Яшчэ паўгадзіны — і Валерыя, цалкам задаволеная, пакідае кабінет. Яе радасць тлумачыцца проста: важыць 42,5 кілаграма пры росце 163 сантыметры — нядрэнны вынік, чаму спрыяюць заняткі мастацкай гімнастыкай. Наш медагляд, па сутнасці, скончаны, і заняў ён 1 гадзіну 40 хвілін. Праўда, па даведку ўсё ж давядзецца прыйсці да педыятра ў іншы дзень: вынікі аналізаў будуць гатовы толькі заўтра, як і расшыфраваная ўрачом электракардыяграма.

**Алена КРАВЕЦ.**

### ❍ АФІЦЫЙНА

**Галіна ЦІЖ, загадчык 1-га педыятрычнага аддзялення УАЗ «3-я дзіцячая клінічная паліклініка г. Мінска»:**

— Дыспансерызацыя ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пастановай № 96 Міністэрства аховы здароўя ад 12.08.2016. Дакумент прадпісвае, якія лабараторныя абследаванні і агляд якіх спецыялістаў павінна прайсці дзіця ў тым ці іншым узросце. Калі малому год — яно прыходзіць на прыём да ўрачоў пэўных спецыялізацый, у два — ужо да іншых. Бацькі атрымліваюць штогадовы індывідуальны план з пералікам усіх абследаванняў, якія мусіць прайсці дзіця. Работу ўрача, дарэчы, спрашчае сістэма інфарматызацыі, якая дзейнічае ў паліклініцы. Індывідуальны план выдае камп'ютарная праграма, куды ўчастковаму педыятру даводзіцца ўнесці толькі свае карэктывы.

Дыспансерызацыя дапамагае кантраляваць стан здароўя, выяўляць адхіленні, а таксама станы, якія папярэднічаюць пэўным захворванням, і своечасова назначаць прафілактычныя мерапрыемствы, каб прадухіліць іх узнікненне. Найчасцей у сённяшніх школьнікаў выяўляюцца хваробы апорна-рухальнага апарату, у прыватнасці скаліёз, а таксама афтальмалагічныя і стаматалагічныя захворванні. Таму кантроль паставы і зроку, а таксама прафілактычны агляд у стаматолага ўсе дзеці праходзяць штогод. Дзіцяці з хранічнымі захворваннямі ў індывідуальным плане назначаюцца дадатковыя абследаванні.

Каб наладзіць рытмічную работу і пазбегнуць вялікіх чэргаў перад кабінетамі перад пачаткам навучальнага года, мы інфармуем бацькоў, што дыспансерызацыю варта праходзіць у месяц нараджэння дзіцяці. Па выніках медагляду выдаецца даведка аб стане здароўя, тэрмін яе дзеяння — адзін год. У выпадку, калі бацькі прыйшлі пазней, даведку яны ўсё роўна атрымаюць тэрмінам дзеяння толькі да даты нараджэння.

■ Ведай сваё

Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў першым прыватным музеі грошай

# «КОПІЙ У НАС НЯМА, УСЁ САПРАЎДНАЕ!»

**Кажуць, лічыць у чужым кашальку — дрэнны тон. А калі ў сваім? І не толькі ды не столькі лічыць, колькі вывучаць з іх дапамогай гісторыю роднага краю? Тады вам прамая дарога на Зыбіцкую, у музей Groshi.**



Адметнасцяў у спецыялізаванага музея, што размешчаны ў гістарычным цэнтры сталіцы, адразу некалькі. Па-першае, у адрозненне ад старэйшага сабрата пры Нацыянальным банку ён адкрыты шэсць дзён на тыдзень, акрамя панядзелка, і агульнадаступны: трапіць сюды можна проста з вуліцы, без папярэдняга запісу і чакання арганізаванай экскурсіі. А па-другое — і гэта асобна падкрэсліваецца — тут размешчаны толькі арыгінальныя грашовыя адзінкі, без ніякіх копій.

Калекцыю, аснову якой складаюць памятныя і юбілейныя манеты Нацбанка, яе ўладальнік, фінансіст і выкладчык Андрэй МІСЬКО збіраў больш як 10 гадоў. Спачатку толькі для сябе, а потым вырашыў: чаму б і іншым не паказаць у прамым і пераносным сэнсе багаты свет беларускіх грошай? На сёння ў экспазіцыі прадстаўлены манеты і банкноты, якія мелі хаджэнне на Беларусі за апошнія 120 гадоў. «Ёсць у калекцыі і больш старыя манеты і банкноты, але цалкам мы закрываем гісторыю грашовага абарачэння менавіта за гэты перыяд, таму яго паўсюдна і заяўляем, — падкрэслівае Андрэй Міська. — Безумоўна, хочацца папаўняць калекцыю, скажам, набыць адну з памятных манет, выпушчаных да 200-годдзя Адама Міцкевіча, у якіх спачатку дапусцілі памылку і пазначылі год смерці 1854-ы, а не 1855-ы і нават паспелі прадаць 93 штукі гэтых манет, а потым серыю выключылі з продажу, і цяпер такі каштоўны «брак» практычна не знайсці... Але гэта ўсё ў перспектыве, як і пашырэнне экспазіцыі, адкрыццё інтэрактыўных зон для дзяцей і г. д. Пакуль трэба ўласна раскручваць і прадаваць прадукт, які ў нас атрымаўся. Мяркую, калекцыянаванне пастаўлю на паўзу на некалькі месяцаў, каб шчыльна заняцца прасоўваннем музея».







Што ж прапануюць наведвальнікам Groshi? Пры вонкава сціплых памерах экспазіцыі тут ёсць на што паглядзець: і яшчэ свежыя ў памяці «зайчыкі», і знакамітыя «сталінскія анучы» — нязвыклa вялікія банкноты ўзору 1947 года, і «Кацькі» ды «керанкі», і акупацыйныя маркі, і памежныя ўкраінскія грыўні, што пэўны час мелі хаджэнне на Палессі, — тутэйшыя называлі іх «жаўткамі» з-за колеру. У вітрыне з грыўнямі заўважаем незвычайныя капейкі: яны па аналогіі з дробнымі манетамі, вядомымі яшчэ з XVI стагоддзя, называліся «шагі» і выпускаліся ў выглядзе марак. А побач уражваюць вузкамясцовыя купюры, выпушчаныя падчас грамадзянскай вайны ў 1918 годзе ў асобных паветах: напрыклад, падпісаныя паштучна кіраўнікамі паветаў слуцкія, гомельскія, магілёўскія рублі — апошнія, між іншым, «злізаныя» з аналагічных адэскіх грошай... «Адразу прыгадваюцца пан атаман Грыцыян Таўрычаскі з «Вяселля ў Малінаўцы» і Папандопула з яго шчодрай прапановай: «Бяры ўсё, я сабе яшчэ намалюю!» — смяёмся мы з фатографам.

Таксама ў калекцыі — вэксалі, купоны і аблігацыі розных часоў (на адной вока чапляецца за дату — 1864 год), раннія савецкія купюры, падпісаныя на розных мовах, ад беларускай да кітайскай — так палымяна і цвёрда камуністы некалі верылі ў сусветную рэвалюцыю, і памятныя манеты, прысвечаныя самым розных падзеям і эпохам: ад жыццёвага шляху Францыска Скарыны да Алімпіяды-80, асваення космасу або 100-годдзя беларускай міліцыі.

«Па старых манетах у нас ёсць некаторыя прабелы, а вось банкноты трапляюцца нават вельмі рэдкія, — заўважае экскурсавод музея Ілья Чарняўскі. — Шырока акупацыя, менш прадстаўлены пачатак усталявання савецкай улады — тады вельмі хутка мяняліся грошы, выпускаліся яны, як правіла, малымі тыражамі, так што на сёння гэта вялікая рэдкасць. Часта наведвальнікі пытаюцца: чаму, маўляў, вы сабралі грошы толькі за 100—120 гадоў, чаму не прадстаўлена Вялікае Княства Літоўскае? А таму, што ёсць мноства нюансаў: набываць і афармляць у музей грошы ўзростам больш за 150 гадоў — гэта і вельмі дарагая справа, і юрыдычна складаная, дый экспазіцыя такіх аб'ёмаў вымагае значна большых выставачных плошчаў. Мы толькі пачынаем, аднак калі ініцыятыва знойдзе водгук у беларусаў і замежных турыстаў, то, канешне, будзе і далейшае развіццё».

Асобна нам паказваюць узоры грошай, якія маглі з'явіцца ў Беларусі ў 1994-м, — банкноты наміналам у 5, 10, 20, 50 рублёў, упрыгожаныя партрэтамі класікаў: Купала, Колас, Багдановіч, Скарына... У агульную экспазіцыю іх не змяшчалі, каб не парушаць прынцып «толькі арыгіналы» — усё ж гэта копіі. Да таго ж, па сутнасці, сапраўднымі грашыма «скарынаўскія рублі» так і не сталі: пакуль эскізы былі зацверджаныя, пакуль надрукавалі ў Германіі першы тыраж, пакуль знізіўся да прымальнага ўзровень інфляцыі, у нашай краіне ўжо змяніліся палітычныя і эканамічныя ўмовы і дзяржаўная сімволіка.

Якія яшчэ рэдкасці можна ўбачыць у экспазіцыі? Напрыклад, першы савецкі чырвонец альбо руска-польскія манеты XIX стагоддзя, выпушчаныя пры Мікалаі І. Калі Царства Польскае ўвайшло ў склад Расійскай Імперыі, то, каб прывучыць мясцовае насельніцтва да новых грошай, гадоў з дзесяць іх выпускалі на дзвюх мовах: з аднаго боку — рускі рубель, з другога — польскі злоты. Здзіўляюць і наміналы: вось 3/4 рубля, роўныя пяці злотым, а вось 7 рублёў 50 капеек узору 1897 года, якія былі ў абарачэнні ўсяго год...

— Я хоць і гісторык па адукацыі, помню ўніверсітэцкі курс нумізматыкі і да пачатку працы ў музеі меў пэўнае ўяўленне пра грашовае абарачэнне ў Беларусі, але таксама зрабіў для сябе нямала адкрыццяў, — прызнаецца Ілья Чарняўскі. — Таму, на мой погляд, наведаць музей будзе цікава і карысна самаму шырокаму колу людзей, ад школьнікаў да пенсіянераў. Не гаворачы ўжо пра замежнікаў. Бачылі б вы, з якімі вачыма ад нас выходзілі кітайцы! А адзін брытанскі турыст практычна не глядзеў экспазіцыю, затое адразу набыў у сувенірным аддзеле адну з даволі дарагіх памятных манет.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**

### Цікавінкі пра Groshi

➢ Ад задумы да рэалізацыі праекта музея прайшоў год.

➢ Пачатак калекцыі паклала памятная манета «Рысь», якая трапіла ў абарачэнне ў 2008 годзе.

➢ Сярэдні кошт аднаго музейнага экспаната — 50 долараў, а ўсяго ў калекцыі прыкладна 1500 манет і банкнотаў.

➢ Сярод самых старых экспанатаў — манета 1560 года выпуску і банкнот 1898-га.

➢ Напярэдадні афіцыйнага адкрыцця музей 10 дзён працаваў у тэставым рэжыме, і толькі за гэты час яго наведала каля 600 чалавек. У кнізе водгукаў ужо ёсць запісы на беларускай, рускай, украінскай і французскай мовах.




*Ліла у ліпені залева —*
*Перажылі, што ні кажы!*
*А ў жніўні новы цуд —*
*над Крэвам*
*Шалеюць зорныя*
*дажджы.*

*Нябёсы шлюць*
*выпрабаванне:*
*Мільёны знічак*
*падлічыць*
*І кожнай загадаць*
*жаданне*
*Ў кароткай летняе*
*начы.*

*Спакуса зорных*
*абяцанняў*
*Не парушае*
*мой спакой.*
*Навошта мне*
*мільён жаданняў?*
*Адно патрэбна —*
*быць з табой.*

## «ЛіМ» знаёміць з паэзіяй Бангладэш

**Усё часцей і часцей на старонках беларускіх літаратурна-мастацкіх выданняў з'яўляюцца пераклады на беларускую мову творы мастакоў слова з краін Азіі. І калі раней у Беларусі добра ведалі, часта выдавалі паэзію і прозу літаратараў з Узбекістана, Таджыкістана, Туркменістана, Казахстана, Кыргызстана, то цяпер у «Полымі», «Маладосці», «Літаратуры і мастацтве» змяшчаюцца пераклады творцаў з Кітая, Пакістана, Індыі і іншых краін.**

А ў нумары штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» за 24 жніўня — публікацыя вершаў паэтаў Бангладэш. Мікола Мятліцкі пераклаў верш Казі Назруло Іслама «Мяцежнік». А Марыя Кобец — два вершы Лалона: «Невядомая птушка» і «Калі Рака Часу высахне...».

— Мне па душы знаёмства з паэзіяй творцаў з Бангладэш, — расказвае Марыя Кобец. — Я ўвогуле з цікавасцю працую над перакладамі. Апошнім часам вось адкрыла для сябе паэзію на мове бенгалі. Чытаю вершы Казі Назруло Іслама, Лалона — і знаёмлюся з Бангладэш, адкрываю новы свет. І хачу, каб следам за мною да асэнсавання іншанацыянальнай культурнай, мастацкай прасторы прычыніўся і беларускі чытач.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

## Извещение о проведении 25 сентября 2018 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| «Весовая проходная» общей площадью 62,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21229 (составные части и принадлежности: одноэтажное панельное здание весовой проходной с технологической асфальтобетонной площадкой а, пешеходной дорожкой а1); «административно-производственный корпус» общей площадью 346,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21228 (составные части и принадлежности: одноэтажное бетонное здание административно-производственного корпуса с двумя пристройками Б1/к, В1/к); «здание мехмастерских» общей площадью 347,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21226 (составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание мехмастерских с пристройкой Б1/к); «бытовой корпус» общей площадью 187,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21227 (одноэтажное кирпичное здание бытового корпуса); «туалет кирпичный» общей площадью 4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 601/С-21225 (одноэтажное здание кирпичного туалета); «водопроводная сеть» с инв. № в ЕГРНИ 601/С-21231 (составные части и принадлежности: водопроводная сеть В, артезианская скважина В1, водопровод В2); «электросеть» с инв. № 601/С-21234 (составные части и принадлежности: электросеть, состоящая из девяти участков сети 1.1, 1.2, 1.3, 1.4, 1.5, 1.6, 1.7, 1.8, 1.9, комплектной трансформаторной подстанции 1.10 с опорой линии электропередачи 1.10.1); «трансформатор силовой», инв. № 706-1 |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,1412 га, кадастровый номер – 623200000028000002 |
| Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Логойский р-н, район г. п. Плещеницы |
| Начальная цена – 149 500,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка – 14 900,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр. Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (покупатель) обязуется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукционных торгов возместить организатору торгов затраты за организацию и проведение аукциона. Информация о сумме затрат за организацию и проведение аукциона, подлежащих возмещению, доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 25 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 27.08.2018 по 21.09.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(024) 970-96-06; (029) 602-33-12 (ОАО «ДСТ № 5»).

---

ОАО «Світанак» г. Жодино приглашает организации принять участие в переговорах на выполнение ремонта футеровки топки парового котла ДЕ 10-14ГМ в котельной ОАО «Світанак» г. Жодино. Заявки принимаются по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 10.00 04.09.2018 г. За дополнительной информацией обращаться по тел.: 8 (01775) 7-14-92, 7-97-74.

УНП 600038919

---

Утерянный полис серии БА № 1177827 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» считать недействительным.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже **магазина общей площадью 632,3 кв. м, инв. № 630/С-69297, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004279 площадью 0,3953 га (право аренды до 2111 года), по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 144**.

Часть Объекта (66,7 кв. м) сдается в аренду *(сведения об арендаторе можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 016 469,07** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 101 646,00 бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **27.09.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.09.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

---

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «ВМЕСТЕ ПО СКАНДИНАВИИ – 2»

1. Организатор Рекламной игры – Общество с ограниченной ответственностью «Еврофасадсервис» (далее – «Организатор») УНП 190797364, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета № 146 от 26 января 2007 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190797364.

Юридический адрес: 220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 13, кабинет 3.

Почтовый адрес: 220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 13.

2. Наименование Рекламной игры: *«Вместе по Скандинавии – 2»*.

3. Место (территория) проведения Игры – Республика Беларусь.

4. Срок начала Игры – 27 августа 2018 г., срок окончания Игры – 28 февраля 2019 г.

5. Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Рекламной игры (далее – «Комиссия») в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав комиссии:

Председатель комиссии:

Алешко Юрий Викторович – директор ООО «Еврофасадсервис».

Члены комиссии:

Акатенкова Наталия Владимировна – главный бухгалтер Частного предприятия «Спектр Экспресс».

Богуцкая Ольга Олеговна – начальник отдела продаж ООО «Еврофасадсервис».

Бодрицкий Дмитрий Игоревич – юрисконсульт ООО «Еврофасадсервис».

Якубович Виталий Владимирович – заместитель директора по финансовым вопросам ООО «Еврофасадсервис».

6. Рекламная игра проводится с целью стимулирования продаж продукции ООО «Еврофасадсервис»: изделия из ПВХ и алюминиевого профиля, реализуемых Обществом с ограниченной ответственностью «Еврофасадсервис».

7. Участники Рекламной игры:

К участию в Рекламной игре приглашаются все совершеннолетние граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

8. Условия участия в Игре.

Для того чтобы стать участником Игры, лица, отвечающие изложенным выше требованиям, должны выполнить следующие условия в период времени с 27 августа 2018 г. по 26 января 2019 г. (включительно):

– заключить договор на приобретение изделия из ПВХ и (или) из алюминиевого профиля на сумму от 100 рублей и более, без учета стоимости монтажных работ (при их проведении). Под изделием понимается окно, рама, дверь без учета стоимости подоконников, отливов, москитных сеток;

– произвести полную оплату заключенного договора (договора поставки, договора подряда) путем внесения всей суммы по заключенному договору либо по факту отгрузки (установки) изделий.

Помимо договоров, по которым произведена полная оплата, в Рекламной игре участвуют договоры, заключенные в рамках партнерской программы Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» по предоставлению кредита на потребительские нужды «Рассрочка без переплат», а также договоры, по которым расчет произведен с помощью «Карты покупок» Открытого акционерного общества «Белгазпромбанк» и по карте «Халва» Закрытого акционерного общества «МТБанк».

В Рекламной игре не участвуют договоры, по которым предоставлена рассрочка оплаты от ООО «Еврофасадсервис»;

– принять работы по акту сдачи-приемки выполненных работ и подписать его, или подписать товарно-транспортную накладную на отгруженное изделие (изделия);

– вернуть экземпляры документов ООО «Еврофасадсервис».

В договор вписываются фамилия, имя, отчество гражданина(ки) (полностью), мобильный телефон (с указанием кода оператора), электронная почта, место регистрации и место проживания (если оно отлично от места регистрации). Заключая договор гражданин(-ка) выражает свое согласие на участие в Рекламной игре путем заполнения строки в договоре о том, что он (она) согласен участвовать в Рекламной Игре;

– при заключении договора гражданин(-ка) в случае выражения согласия на участие в Рекламной игре получает от специалиста по продажам в офисе, расположенном по адресу: г. Минск, ул. Машиностроителей, 13, либо от технолога на выезде по адресу заключения договора, купон участника (далее – купон). Купон заполняется в двух экземплярах. Один заполненный купон остается у участника Игры, другой остается у Организатора. Купон содержит информацию о Рекламной игре и уникальный номер для участника Игры, который вписывается специалистом по продаже или технологом Организатора. Номер для регистрации участника, указанный в купоне, совпадает с номером заключенного договора. Номер договора является уникальным для каждого участника Игры;

– ознакомиться с Правилами Игры, размещенными на сайте www.evrofasad.by, либо у специалиста по продажам в офисе или технолога на выезде по адресу заключения договора.

Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии покупки необходимого товара на нужную сумму и выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре. ВСЕ УЧАСТНИКИ ДОЛЖНЫ СОХРАНИТЬ ДОГОВОРЫ, СЧЕТА, ТТН И (ИЛИ) АКТЫ ВЫПОЛНЕННЫХ РАБОТ, КУПОНЫ С УНИКАЛЬНЫМИ НОМЕРАМИ ДО ОКОНЧАНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ.

Участвуя в Рекламной игре, ее Победитель соглашается с тем, что любые его данные, в том числе имена, отчества, фамилии, фотографии и видеоизображения, могут быть использованы Организатором Рекламной игры в рекламных целях в рамках проведения данной Рекламной игры без предварительного согласия Победителя и без каких-либо денежных выплат.

9. Призовой фонд Игры:

Призовой фонд игры формируется за счет имущества и денежных средств Организатора в размере 1 157,03 (одна тысяча сто пятьдесят семь рублей 3 копейки). Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

**Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.**

| № | Наименование | Количество | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Сертификат на поездку в экскурсионный тур по Скандинавии на двоих человек.<br>В стоимость тура входит: проезд автобусом Минск–Рига–Стокгольм–Турку–Хельсинки–Таллинн–Минск, проезд на пароме по программе, ночлег на пароме (2 ночи), экскурсионная программа в Риге, Стокгольме, Турку, Хельсинки, Таллинне.<br>В тур не входит: питание, входные билеты, ужины на пароме, консульский сбор (оформление визы), медицинская страховка.<br>Тур предоставляется с открытой датой: 03.03.2019 г. – 31.05.2019 г., что означает, что Победитель получает экскурсионный тур в этот период | 1 штука | 849,47 | 849,47 |
| | Денежная часть приза | | 110,35 | 110,35 |
| 2 | Мобильный телефон Lenovo Vibe C (A2020) 8 Gb | 1 штука | 186,00 | 186,00 |
| | Денежная часть приза | | 11,21 | 11,21 |

10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, уведомления победителя и выдачи приза.

Розыгрыш призов проводится 31 января 2019 г. в 14.00.

Место проведения: г. Минск, ул. Машиностроителей, 13. Розыгрыш проводится открыто, в присутствии Комиссии и с возможностью присутствия на нем участников Рекламной игры, в следующем порядке.

Проведение розыгрыша:

1) Все купоны участников Рекламной игры помещаются в лототрон и перемешиваются.

2) Победитель определяется путем извлечения из лототрона купона участника Членом Комиссии.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в таблице № 1 Призовой фонд Рекламной игры, указанной в пункте 9 настоящих правил.

После проведения розыгрыша выигравших участников Организатор уведомляет в день проведения розыгрыша по телефону посредством звонка и смс – сообщением о выигрыше и о месте, дате и времени получения призов, и в срок до 4 февраля 2019 г. (включительно) о выигранном призе посредством письма по почте с уведомлением с указанием приза и контактного телефона, по которому можно будет получить информацию о месте, дате и времени получения приза.

Для того чтобы получить приз, Победители должны:

Обратиться к Организатору по адресу: г. Минск, ул. Машиностроителей, 13, в период с 5 февраля 2019 г. по 13 февраля 2019 г. (включительно) ежедневно с 10.00 до 16.00, в субботу с 09.00 до 14.00, кроме воскресенья и праздничных дней.

Для получения призов Победители должны предъявить:

1) Паспорт или вид на жительство;

2) Купон (оригинал);

3) Договор, счет, ТТН и (или) акт выполненных работ.

Победителю, выигравшему мобильный телефон, необходимо подписать документы, связанные с оформлением выдачи приза.

Победителю, выигравшему путевку, необходимо подписать документы, связанные с оформлением выдачи приза, и получить сертификат на поездку, а также предоставить Организатору копию паспорта на второе лицо для оформления путевки. Копию паспорта на второе лицо необходимо предоставить в течение трех рабочих дней после получения сертификата на поездку. В случае несвоевременного предоставления копии паспорта на второе лицо путевка будет оформлена только на Победителя Игры. Организатор передает копии паспортов в турагентство ООО «Экотур-6».

Получив сертификат, Победитель обязан обратиться в агентство до 28 февраля 2019 г. и определиться с датой поездки (даты заездов будут предоставлены на выбор в период с 03.03.2019 г. по 31.05.2019 г.). Если Победитель не обратится в указанный срок в турагентство, то он теряет право на получение приза. Для получения путевки на двух человек Победитель приходит в офис турагентства ООО «Экотур-6», расположенного по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 1А, оф. 507.

В соответствии с главой 16 Налогового Кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении приза выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза. Вручение призов Победителям осуществляется за минусом суммы денежных средств в размере возмещения подоходного налога.

Призы оформляются на имя Победителей. Отказ Победителя от приза в пользу третьего лица не допускается.

Если Победители не обратились за получением призов в срок до 13 февраля 2019 г. (включительно), призы остаются в распоряжении Организатора.

Если Победитель не обратился для оформления путевки к туроператору в срок до 28 февраля 2019 г., путевка считается неполученной.

Если Победитель не воспользовался предоставляемым призом в указанные в настоящих Правилах сроки, он не вправе требовать от Организатора предоставления возможности использования приза в другой срок.

Денежная компенсация за отказ по каким-либо причинам от приза участнику, выигравшему приз, не выдается.

Правила Игры публикуются в газете «Звязда» до начала Рекламной игры. Результаты розыгрыша призового фонда публикуются в этом же издании до 4 февраля 2019 г. (включительно).

11. Телефоны для справок:

(Городской) 388-10-60, (Мобильный) 8 044 789 19 40.

Время работы – с 09.00 до 18.00, за исключением выходных и праздничных дней.

Свидетельство № 3352 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 10 августа 2018 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

---

## Логойский сельский исполнительный комитет проводит 25 сентября 2018 года открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Знаменка, У-2, 623284603001000207 | 0,1063 | газо- и водоснабжение | 5 000,00 | 1683,09 + реклама | 500,00 |
| 2 | д. Понизовье, ул. Дорожная, 7, 623284604601000146 | 0,1380 | | 2 500,00 | 73,50 + реклама | 250,00 |

Земельный участок в д. Понизовье, ул. Дорожная, 7 имеет ограничения в использовании площадью 0,1380 га в связи с расположением в охранной зоне реки Гайна.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на № BY25AKBB36006191011030000000 БИК AKBB BY 2X г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код – 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 25 сентября 2018 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. **Последний день приема заявлений – 19 сентября 2018 года до 17.00.** Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11.

# ЗЯМЛЯ КХМЕРАЎ

**Выбаркам Камбоджы нарэшце апублікаваў афіцыйныя вынікі выбараў у Нацыянальную асамблею (яны прайшлі яшчэ 29 ліпеня). Паводле гэтых даных, перамагла кіруючая Народная партыя Камбоджы (НПК) на чале з прэм'ер-міністрам Хун Сенам, атрымаўшы ўсе 125 крэслаў у парламенце. За НПК было пададзена амаль 4,9 мільёна галасоў — 76,8 працэнта ад агульнай колькасці тых, хто ўдзельнічаў у выбарах. Як паведаміў прэм'ер-міністр, парламент новага склікання і ўрад будуць створаны адпаведна 5 і 6 верасня. Фактычна НПК на чале з Хун Сенам атрымала паўнаважкі мандат на кіраванне краінай на наступную пяцігодку. Куды рушыць Камбоджа?**



## ЗАГАДКІ ІМПЕРЫІ

Камбоджа насамрэч зямля кхмераў. З дагістарычных часоў Індакітайскі паўвостраў засялялі мон-кхмерскія народы, якія, хутчэй за ўсё, прыйшлі сюды ў яшчэ больш ранні перыяд з Інданезіі і Палінезіі. Тэрыторыя іх рассялення была значна шырэйшая, чым плошча цяперашняй Камбоджы, і займала поўдзень сучаснай М'янмы, амаль увесь Тайланд, паўднёвую частку Лаоса, усю Камбоджу і вялікую частку В'етнама. Гэтыя народы знаходзіліся на вельмі высокай стадыі развіцця. Узрослая на індыйскай культуры імперыя кхмераў праіснавала паўтысячагоддзя, перш чым, падпарадкоўваючыся загадкавым абставінам, нечакана развалілася пад націскам ворага.

Да шостага стагоддзя большая частка цяперашняй Камбоджы належала каралеўству Фуна, якое паклала пачатак фарміраванню адметнай культуры. З 802 года вядзе адлік адна з найвялікшых старажытных імперый — Кхмерская. Яна ахоплівала тэрыторыю сучасных Камбоджы, Тайланда, Лаоса, В'етнама, Бірмы і Малайзіі. Самы буйны ў свеце сярэднявечны горад знаходзіўся ў Паўднёва-Усходняй Азіі. Гэта была сталіца Кхмерскай імперыі Ангкор. У перыяд росквіту колькасць жыхароў тут дасягала мільёна чалавек. Для Сярэднявечча гэта проста касмічныя лічбы!

Уладары імперыі кхмераў Камбуджадэша панавалі над сотнямі тысяч падданых і валодалі велізарнымі тэрыторыямі. Сіла іх беспрэцэдэнтнай улады заключалася ў разумным выкарыстанні вады. На працягу стагоддзяў даведзеная да дасканаласці ірыгацыйная сістэма, якая складаецца з каналаў, дамбаў і вялікіх штучных рэзервуараў, дазваляла кхмерам збіраць да трох ураджаяў рысу ў год! Гэтая «гідраўлічная цывілізацыя» спрыяла незалежнасці грамадства ад пары года і мусонных дажджоў і заклала аснову для неверагодна вялікай нават па сусветных маштабах колькасці насельніцтва.

Уздым імперыі пачаўся ўжо ў канцы IX стагоддзя, з пераезду караля Яшовармана I у новую сталіцу Яшодхарапура. Горад узнік на месцы, дзе тры ракі ўпадаюць у самы вялікі прэснаводны вадаём у Азіі — у багатае на рыбу возера Танлесап, званае таксама Камбаджыйскім унутраным морам. Тут і з'явілася ірыгацыйная сістэма, якая паклала пачатак небывалай магутнасці Кхмерскай імперыі. Рукатворныя вадасховішчы кхмераў былі акружаны дамбамі. Гэта былі цалкам практычныя ірыгацыйныя збудаванні, якія сімвалізавалі асобую сутнасць кіраўніка, які атаясамліваўся з богам Індрай. У адпаведнасці з сакральным значэннем храмавы комплекс уяўляў сабой мадэль Сусвету з гарой Меру ў цэнтры, а навакольныя храмы, вадасховішчы (барай) увасаблялі сусветны Акіян.

На старонках навуковага часопіса Proceedings of the National Academy of Sciences спецыялісты з Кембрыджскага ўніверсітэта апублікавалі вынікі сваіх найноўшых даследаванняў аб прычынах занепаду кхмерскай феадальнай дзяржавы ў першай палове XV стагоддзя. Сярод магчымых прычын гібелі імперыі ў 1431 годзе называецца ўварванне варожых войскаў, гвалтоўнае пераваробванне жыхароў у будызм, але даследчыкі звярнулі ўвагу і на сукупнасць іншых прычын, якія прывялі да разбурэння ўсяго дзяржаўнага арганізма.

Брытанскімі спецыялістамі былі ўзятыя пробы асадкавых парод у бараях, размешчаных у гіганцкім храмавым комплексе ў Камбоджы Ангкор-Ват, што азначае «горад-храм», які прысвечаны богу Вішну. Гэты рэзервуар восем на два кіламетры быў самым вялікім з чатырох вадасховішчаў у Ангкоры і ўмяшчаў да 53 мільёнаў кубаметраў вады. У выніку яны прыйшлі да папярэдняй высновы, што кхмеры не здолелі своечасова прыняць неабходных мер. «Іх арашальная сістэма аказалася няздольнай адрэагаваць на змены выпадзення ападкаў», — паведаміла Мэры Бэт Дэй і яе калегі з Кембрыджскага ўніверсітэта.

## У СЯРЭДНЯВЕЧЧА — З ПОЛ ПОТАМ

Каралеўства Аюдхуа захапіла Анкор у 1432 годзе, у выніку краіна на паўтара стагоддзя была ахоплена міжусобіцамі і дынастычнымі войнамі. У сутычках прымалі актыўны ўдзел партугальцы і іспанцы. Палітычнае становішча не змянялася аж да з'яўлення французаў у 1863 годзе і падпісання дагавора аб пратэктарацэ. А ў 1884-м быў падпісаны яшчэ адзін дагавор, паводле якога краіна стала калоніяй. У 1941 годзе французы пасадзілі на камбаджыйскі трон маладога прынца Сіянука. Але памыліліся ў сваім выбары: Сіянука ўступіў у барацьбу з каланіяльным рэжымам і дамогся незалежнасці Камбоджы



ў 1953 годзе. Прынц кіраваў краінай наступныя пятнаццаць гадоў, а пасля быў зрынуты ваенным рэжымам. Злучаныя Штаты ў 1969 годзе правялі бамбаванне камуністычных баз у Камбоджы, уцягнуўшы яе ў амерыкана-в'етнамскі канфлікт. У 1970 годзе арміі ЗША і Паўднёвага В'етнама акупавалі тэрыторыю Камбоджы, імкнучыся знішчыць камуністычныя атрады, але яны толькі адкінулі партызанаў углыб краіны.

У 1975 годзе ўладу ў Пнампені захапілі «чырвоныя кхмеры» (левардыкальны экстрэмісцкі рух аграрнага тыпу) на чале з Пол Потам. Іх ідэалогія грунтавалася на непрыманні ўсяго сучаснага і звязанага з заходняй цывілізацыяй. Краіна аказалася адрэзанай ад знешняга свету. За 3 гады 8 месяцаў і 20 дзён свайго кіравання яны адсунулі Камбоджу ў крывавае Сярэднявечча. У пратаколе Камісіі па расследаванні злачынстваў рэжыму Пол Пота ад 25 ліпеня 1983 года адзначалася, што за перыяд паміж 1975 і 1978 гадамі загінула 2 746 105 чалавек, з якіх 1 927 061 селянін, 305 417 рабочых, служачых і прадстаўнікоў іншых прафесій, 48 359 прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў, 25 168 манахаў, каля 100 пісьменнікаў і журналістаў, а таксама некалькі замежнікаў. Пакаранні на так званых палях смерці ў мэтах эканоміі боепрыпасаў у асноўным праводзіліся «падручнымі сродкамі»: малаткамі, сякерамі, рыдлёўкамі і бамбукавымі каламі, а таксама праз павешанне. 568 663 чалавекі зніклі без вестак і альбо загінулі ў джунглях, альбо закапаныя ў масавых пахаваннях. Агульная колькасць ахвяр ацэньваецца ў 3 374 768 чалавек...

У 1978-м в'етнамскія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Камбоджы, «чырвоныя кхмеры» адступілі ў трапічныя раёны і амаль дзесяць гадоў вялі партызанскую вайну. У 1993 годзе адбыліся выбары, якія прывялі да аднаўлення Нарадома Сіянука на троне і прыняцця новай канстытуцыі, гэтыя выбары падтрымалі амерыканцы. Налета ўрад Камбоджы аб'явіў фарміраванне «чырвоных кхмераў» незаконным. Да ўлады прыйшоў Хун Сен, які і цяпер з'яўляецца дзейным прэм'ер-міністрам. Адметна, што ў маладосці ён прымыкаў да «чырвоных кхмераў», але ў 1977 годзе збег у В'етнам і стаў членам урада краіны ў выгнанні. У 1998 годзе адбыліся перавыбары, Хун Сен захаваў сваю пасаду нягледзячы на незадаволенасць апазіцыі. Яшчэ адна падзея адбылася ў гэтым годзе: смерць Пола Пота ад меркаванага інфаркту. Вестка была сустрэта народным гневам, бо ён не паспеў паўстаць перад судом.

## ЗЯМЕЛЬНАЕ «ТАБУ»

У адпаведнасці з канстытуцыяй 1993 года Камбоджа — канстытуцыйная манархія, ліберальная парламенцкая дэмакратыя з шматпартыйнай сістэмай. Кіраўніком дзяржавы з'яўляецца кароль. Ён не валодае выканаўчай уладай (якая сканцэнтравана ў руках прэм'ер-міністра), але з'яўляецца галоўнакамандуючым узброенымі сіламі і дае згоду на прызначэнне членаў урада. Большасць насельніцтва гэтай краіны (95 працэнтаў) — будысты.

У 1990-я народная гаспадарка пачала паступова аднаўляцца пасля разбуральных грамадзянскіх войнаў. Да 1997-га штогадовая вытворчасць асноўнай сельскагаспадарчай культуры — рысу — дасягнула 3,5 мільёна тон. У 1997—1998 гадах эканоміка краіны значна пацярпела ад фінансавага крызісу ў рэгіёне і палітычнай нестабільнасці, замежныя інвестыцыі і паток турыстаў скарацíліся. Але ўжо ў 1999-м — першым мірным годзе за 30 гадоў — быў дасягнуты эканамічны рост у 5 працэнтаў. Нягледзячы на цяжкія паводкі, ВУП вырас на 5 працэнтаў у 2000-м, на 6 працэнтаў — у 2001-м і на 5 працэнтаў — у 2002-м. Турызм павялічыўся на 34 працэнты ў 2000-м і на 40 працэнтаў — у 2001-м.



Нягледзячы на прыкметныя поспехі, эканамічнае становішча краіны застаецца складаным. Адчуваюцца недахоп адукаваных і кваліфікаваных рабочых рук, неразвітасць інфраструктуры. Як заўважаюць эксперты, пагроза палітычнай нестабільнасці і карупцыя стрымліваюць пашырэнне замежных капіталаўкладанняў. Краіна залежыць ад крэдытаў і дапамогі з-за мяжы. Паводле нацыянальнага заканадаўства, замежнікі не маюць права валодаць зямлёй. Гэтыя меры ў значнай ступені абмяжоўваюць прыток інвестыцый у дробнатаварную сельскую гаспадарку. Праўда, тут ёсць варыянты. Каб стаць уладальнікам зямлі, неабходна зарэгістраваць фірму, не менш за 51 працэнт капіталу якой належыць кхмерам.

Як вядома, аднаўленне Камбоджы пасля разбуральнай грамадзянскай вайны, якая скончылася ў 1989 годзе, у асноўным ажыццяўлялася пры дапамозе ЕС і ЗША, якія абнулілі для каралеўства тарыфы на шэраг тавараў і дазволілі яму развіць вытворчасць тэкстылю (80 % экспарту). Аднак у апошнія гады асноўным інвестарам у краіну стаў Кітай. Тавараабарот паміж КНР і Камбоджай летась склаў $5,8 млрд. Да параўнання: аб'ём узаемнага гандлю з Расіяй за гэты ж час — $166,8 млн.

# ЧЫМ ЗДЗІЎЛЯЕ КАМБОДЖА?

## «КРЫПТА» І ТУРЫЗМ

Сучасныя эканамічныя трэнды не абмінаюць Камбоджу. Сёлета ўрад краіны запусціў уласную нацыянальную крыптавалюту Entapay. Аб гэтым паведаміў віцэ-прэм'ер Мен Сэм Ан. «Entapay — гэта не проста крыптавалюта, якую падтрымлівае камбаджыйскі ўрад. Гэта мультыінструментальная плацежная сістэма ў лічбавай сферы, у якой даступныя функцыі кіравання фінансамі, захоўвання манет, гандлю і абмену. Можна сказаць, што гэта альтэрнатыва сістэме Alipay, толькі на блокчэйне». Урад разлічвае, што Entapay заменіць VISA і стане асноўным спосабам аплаты ў краіне. Але пры гэтым урад супраць з'яўлення прыватнай «крыпты». Усе транзакцыі з іншымі лічбавымі грашыма лічацца ў краіне незаконнымі. Прычым не дазваляецца нават рэкламаваць крыптавалюты. Аналітыкі чакаюць, што Камбоджа абгоніць Філіпіны і стане сталіцай анлайн-гемблінгу (азартных гульняў у інтэрнэце) у Паўднёва-Усходняй Азіі. У прэсе было агучана меркаванне, што падтрымка з боку ўрада і паралельна з гэтым нявызначанасць у дачыненні да рэгулятарнага заканадаўства на Філіпінах робяць Камбоджу больш прывабным месцам для інвестыцый.

Ну і, вядома ж, турызм. Камбоджа год за годам, па ацэнках розных міжнародных агенцтваў, прызнаецца найбольш прыцягальным месцам для гасцей з іншых краін. Галоўная славутасць краіны — храмавы комплекс Ангкор-Ват непадалёк ад горада Сіемрэап, у цэнтры краіны. Ён лічыцца самай вялікай культавай пабудовай у свеце. Таксама маюцца месцы для «пляжнага» адпачынку на поўдні, у раёне горада Сіянуквіля. На тэрыторыі краіны размешчаны 23 нацыянальныя паркі. Турыстычная інфраструктура не гэтак развітая, як у суседнім Тайландзе, але ўсё ж прызнаецца цалкам здавальняючай. Разам з тым спецыялісты раяць не адхіляцца ад вядомых турыстычных маршрутаў: краіна дагэтуль нашпігаваная мноствам мін. З 1979 года ў выніку іх выбухаў канечнасці страцілі каля 60 тысяч камбаджыйцаў. Турызм з'яўляецца адным з ключавых сектараў эканомікі краіны. Летась ён прынёс $3,6 млрд, краіну наведала 5,6 мільёна замежных турыстаў. Найбольшая колькасць сярод іх кітайцаў. Паводле інфармацыі міністра турызму Тонг Хона, чакаецца, што сёлета краіну наведаюць каля 1,7 мільёна кітайскіх турыстаў, а да 2020 года гэты паказчык перасягне 2,5 мільёна. Камбоджа ўсё больш схіляецца ў бок Паднябеснай. І гэта прынясіць адчувальныя дывідэнды.

**Захар БУРАК.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «АГАТ-системы управления» – управляющая компания холдинга «Геоинформационные системы управления», г. Минск, пр-т Независимости, 117, пом. 1 |

**Предмет аукциона**
Недвижимое имущество, расположенное по адресу:
г. Минск, пр-т Независимости, 117/3

| Наименование (Назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **О 1/к Здание административно-хозяйственное** (здание административно-хозяйственное) | 64,6 кв.м. | 500/С-41385 |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,6198** га, предоставлен продавцу для эксплуатации и обслуживания зданий административно-хозяйственных и здания специализированного энергетики на праве аренды (доля 59/100)

**Начальная цена с НДС 20 % – 85 800,00 бел. руб.**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 28.09.2018 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.09.2018 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «Юридическая компания «Приоритет», 211415, г. Полоцк, ул. Нижнепокровская, 41-Б, пом. 26 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Торговый дом «Коптево», г. Новополоцк, пер. Рижский, 10 |

**Предмет аукциона: складская база** в составе: **арочный склад № 1** (701,6 кв. м, инв. № 252/С-3602), **арочный склад № 2** (701,8 кв. м, инв. № 252/С-8822), **резервуары пожарного запаса № 2** (инв. № 252/С-21147) и **№ 3 (**инв. № 252/С-21148) по 75 куб. м **(Витебская обл., г. Новополоцк, пер. Рижский, д. 10 (корп. 4, 5)**

**Начальная цена с НДС 20 % – 266954,40 рубля.**
**Шаг аукциона: 13347,72 рубля.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY39ALFA30122369400010270000 (BYN) в ЗАО «Альфа-Банк» г. Минск, BIC ALFABY2X. Получатель платежа – ООО «Юридическая компания «Приоритет», УНП 391609018

**Аукцион состоится:** 05.09.2018 в 11.00 по месту нахождения организатора торгов.
**Дата и время окончания приема документов:** 04.09.2018 до 17.00 по указанному адресу организатора торгов. **E-mail: yur_k_prioritet@mail.ru. Тел.: +375 0214 46 25 89; +375 29 2314901.**
Подробная информация размещена в газете «Рэспубліка» от 17.07.2018

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже здания основного корпуса, принадлежащего ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов» на праве собственности**

<u>**Лот № 1**</u>. Здание основного корпуса с инвентарным номером 621/С-14517. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, п. Альба, ул. Заводская, 1/1. Назначение: здание специализированное иного назначения. Г. п. – 1901. Этажность – 2. Общая площадь – 1 322,70 кв. м. Составные части и принадлежности: целое двухэтажное кирпичное здание основного корпуса биомицина П2/к с холодной пристройкой. **Начальная цена – 92 197,70 бел. руб. с учетом НДС 20 %. Задаток – 9 219,77 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,1541 га с кадастровым номером 624283500601000179. Целевое назначение земельного участка: земельный участок для обслуживания основного корпуса биомицина. Право постоянного пользования. ОГРАНИЧЕНИЯ (ОБРЕМЕНЕНИЯ) ПРАВ: охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0020 га; охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0158 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0050 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0018 га; зона охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, площадь 0,1541 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

1. Статус: историко-культурная ценность (паспорт от 15.08.2013); 2. Аренда: - часть капитального строения с инвентарным номером 621/С-14517 сдается по договору аренды от 15.12.2014 № 10/ар-14 на срок по 31.12.2020 (площадь, сдаваемая в аренду – 102,31 кв. м); часть капитального строения с инвентарным номером 621/С-14517 сдается по договору аренды от 21.11.2017 № 5/ар-2017 на срок по 31.12.2020 (площадь, сдаваемая в аренду 14,70 кв. м)

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня приобретения права собственности на недвижимое имущество охранное обязательство.
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5 % (пяти процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 25.09.2018 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот № 1), принадлежащего ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов», проводимом 25 сентября 2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7.
Окончание приема заявлений 21.09.2018 в 11.00. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Шинкевич Роман Геннадьевич, тел. +375 (17-70) 6-20-12 (10)

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта в городе Гродно 25 сентября 2018 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Проспект Лебедева | 0,3163 | 440100000001010183 | 33 710,12 | 3 370,00 | 4 732,06 | Строительство контейнерной мойки на 6 легковых автомобилей с благоустройством прилегающей территории |

*земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 25 сентября 2018 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 27 августа по 19 сентября 2018 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 74-20-95, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в г. Кировске 27 сентября 2018 года

**Аукцион состоится 27 сентября 2018 года в 10.00 по адресу: г. Кировск, ул. Кирова, 80, 2-й этаж, каб 34.**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Целевое назначение земельного участка (назначение в соответствии с единой классификацией) | Кадастровый номер | Стоимость документации (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **№ 1** | Могилевская область, Кировский район, агрогородок Павловичи, улица Школьная, за сельским домом культуры | 0,0119 | 25 лет | **Установка и обслуживание торгового павильона (код 1 16 03)** | 722582405101000205 | 2143,24 | 14,96 | 2,99 |

<u>**Принимать участие в аукционе имеют право граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.**</u>

При оформлении заявления и соглашения о правах, обязанностях и ответственности сторон желающими принять участие в аукционе представляются **паспорт**, а также следующие документы: документ, подтверждающий внесение **суммы задатка (задатков**) на расчетный счет главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Могилевской области № BY76AKBB36007170000180000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 700451296 (разовый платеж), **с отметкой банка**; <u>**гражданином**</u> – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; <u>**представителем гражданина**</u> – нотариально удостоверенная доверенность; <u>**индивидуальным предпринимателем**</u> – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; <u>**представителем индивидуального предпринимателя**</u> – нотариально удостоверенная доверенность; <u>**представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь**</u> – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; <u>**представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица**</u> – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; <u>**представителем иностранного гражданина**</u> – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. <u>**Консолидированными участниками**</u> для участия в аукционе представляется также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. Уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет доверенности, выданные гражданами, индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Информация: 1) Условия инженерного развития инфраструктуры: в соответствии с проектно-сметной документацией. 2) Условие проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**. 3) Условие предоставления земельного участка в аренду: в двухмесячный срок со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок получить разрешение на установку торгового павильона, приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня государственной регистрации победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона права аренды этим участком. 4) Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с лотовой документацией всем желающим. 5) **Победитель** аукциона либо **единственный участник** несостоявшегося аукциона **обязан** в течение **10 рабочих дней** со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся **внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, оплатить расходы по публикации извещения в средствах массовой информации и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

6) В предусмотренных законодательством случаях участниками аукциона уплачиваются штрафы: до 100 базовых величин (начальная цена предмета аукциона менее 500 базовых величин). Конкретные размеры штрафов прописываются в соглашениях о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заключаемых с участниками аукциона.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (отдел землеустройства Кировского райисполкома) по адресу: **г. Кировск, ул. Пушкинская, 21а, каб. 6,** в рабочие дни с даты опубликования извещения с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

<u>**Последний день приема заявлений – 24.09.2018 года до 17.00**</u>. **Контактный телефон в г. Кировске (8-02237) 24-8-57**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайон «Заболоть») 25 сентября 2018 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-316* | Микрорайон «Заболоть» | 0,1001 | 440100000002007276 | – | 17 295,12 | 3 500 |
| 2 | Земельный участок У-354* | Микрорайон «Заболоть» | 0,1083 | 440100000002008315 | – | 14 372,37 | 2 800 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 25 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 27 августа по 19 сентября 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный подавший заявление на участие в аукционе в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 74 20 95, 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

## Людміла ЛАБКОВА:

# «Я ЛЮБЛЮ ВЫКЛІК!»

**Яна зрабіла калекцыі адзення для зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года ў Пхёнчхане. Яе імя ўжо стала брэндам жаночай адзежы, якія шырока вядомы не толькі ў Беларусі, але і за мяжой**

**Людміла Лабкова — вядомы модны дызайнер прэт-а-партэ. Гэты французскі выраз азначае адзенне, якое выпускаецца масава. У 2004 годзе яна адкрыла імянную студыю дызайну касцюма. З 2010 года вырабляе ўласную лінію адзення пад брэндам LUDMILA LABKOVA. Да таго ж Людміла Лабкова з'яўляецца вядучым дызайнерам Міністэрства лёгкай прамысловасці, кансультантам па стылі буйных нацыянальных прадпрыемстваў, пастаянным партнёрам тэлеканалаў і модных часопісаў. Гутарка з мастачкай адбылася ў Гомелі, дзе яна адкрывала свой шоу-рум «Аўтарская мода».**



— Мы робім практычныя вырабы пад лозунгам «і ў пір, і ў мір», але ж усё роўна імкнёмся, каб было зразумела, што гэта — дызайнерскае адзенне. Бо няма сэнсу рабіць нешта, падобнае на мас-маркет.

***— Што вас натхніла на стварэнне апошняй калекцыі пад назвай «Райская птушка»?***

— У апошняй калекцыі прысутнічаюць яркія колеры — гэта фотапрынты: рыбкі, птушкі, кветкі. Яны былі сфатаграфаваны на востраве Тэнэрыфэ. Мяне гэта натхніла, і я зрабіла калекцыю пра райскіх птушак. Між тым плануе зрабіць калекцыю з лёну. Я з'яўляюся дызайн-кансультантам канцэрна «Беллегпрам» Міністэрства лёгкай прамысловасці і курырую праект «Беларускі лён». Гэта нацыянальны праект. Мы спрабуем яго прасунуць у Італіі. Цяпер я натхнёная гэтай тэматыкай і стасункамі з маім партнёрам, знакамітым дызайнерам абутку з Італіі Джорджа Фабіяні. З ім мы не так даўно зрабілі сумесны паказ і плануем новы ў верасні — кастрычніку. Спадзяюся, што Джорджа натхніцца беларускім ільном, як я натхняюся стасункамі з ім, яго абуткам. Дарэчы, гэты вялікі мастак не мае мастацкай адукацыі, але сёння яго фабрыкі выпускаюць абутак для сусветна вядомых брэндаў. Спадзяюся, у нас атрымаецца зрабіць ільняную калекцыю. Увогуле, здаецца важным прыцягваць увагу грамадскасці да таго, што папулярызуе наша, адметнае, беларускае. Таму што наша праблема — нелюбоў да свайго. Ведаеце, італьянцы ў гэтым іншыя, і нам гэтаму трэба ў іх вучыцца.

***— Дзе і як вы пазнаёміліся з Джоржыа Фабіяні?***

— Гэта лёс. У Дзюсельдорфе на выстаўцы ў нас былі побач стэнды. І мы зразумелі, як адно аднаму падыходзім. Мы якраз шукалі партнёра па абутку і глядзелі розныя крэатыўныя брэнды. Маркетолагі Фабіяні нам сказалі, што яны закрываюць крамы ў Мінску, а мы вырашылі пакінуць гэты брэнд сабе. Ён нам родны. Фабіяні — цудоўны мастак і майстар. У нас з ім вялікія планы.

***— Вы працуеце з многімі вядомымі беларускімі артыстамі, вядучымі. Напрыклад, вы апранаеце вядомы мужчынскі вакальны калектыў «Чысты голас». Ці цяжка знайсці мяжу паміж пажаданнямі заказчыка і асабістымі ўяўленнямі?***

— Гэта залежыць ад таго, наколькі ёсць блізкасць у гусце і асабістае ўзаемаразуменне з чалавекам. Так, бывае спачатку складана, але потым мы настройваемся адно на аднаго, і становіцца ўсё лёгка. Тэлебачанне і шоу-бізнес — сферы спецыфічныя. Мы заўсёды ўлічваем работу камер, колер студыі... Для мяне складанасці заўсёды ствараюць больш цікавасці — як для мастака, дызайнера і творцы. Я люблю выклік. А калі ты спрацаваў удала, ты можаш сябе за гэта паважаць.

***— Вам выпаў гонар апранаць беларускую зборную для зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года ў Пхёнчхане...***

— Мы тую калекцыю рабілі спантанна, вельмі хутка. Ніхто не паспеў умяшацца, і мы зрабілі так, як палічылі неабходным. Усё было зацверджана без змяненняў. У парадна-афіцыйнай форме наша нацыянальная зборная прысутнічала на ўсіх афіцыйных мерапрыемствах. Адзін з маіх самых любімых партнёраў — гомельскае прадпрыемства «Камінтэрн». Я працавала з імі менавіта па праекце адзення для нашых спартсменаў на апошняй Алімпіядзе ў Пхёнчхане. І цяпер мы разам з імі працуем для «Еўрагульняў», якія пройдуць у Беларусі. Я выкарыстоўваю беларускі лён у новым праекце, а прадпрыемства вельмі добра працуе з гэтым матэрыялам. Я вельмі хачу, каб нас, беларусаў, палюбілі ўсе. Калі нас любяць, мы самі пачынаем сябе любіць і сабой ганарыцца. І тады мы становімся запатрабаванымі. Усё найлепшае, што ў нас ёсць, трэба дэманстраваць: прамысловасць, творчасць, рамёствы...

**«Мы робім практычныя вырабы пад лозунгам «і ў пір, і ў мір», але ж усё роўна імкнёмся, каб было зразумела, што гэта — дызайнерскае адзенне».**

***— Шкада вось толькі, што дагэтуль распаўсюджанае меркаванне, быццам усе беларускія сімвалы — гэта лапці ды вышыванкі...***

— Зразумела ж, іх куды больш. Калі сёння касцюмы ад таго ж «Камінтэрна» павесіць побач з аналагічнымі вырабамі вядомых брэндаў у Мілане — паверце, мы не прайграем. Калі працуюць спецыяліст-маркетолаг разам з піяршчыкам — яны могуць прапанаваць усё, што заўгодна так, што спажывец толькі здзівіцца. А ў нас дастаткова патэнцыялу і крэатыву.

***— Здаецца, што вы дызайнерам нарадзіліся?***

— Сапраўды, так і ёсць. Я не памятаю сябе іншай. Я заўсёды нешта стварала: майстравала, малявала, рэзала тканіну на кавалкі... Для сяброўскіх лялек у дзіцячым садку адзенне малявала пад заказ. Прычым стварала капсульныя тэматычныя калекцыі, прызначаныя, напрыклад для тэатра ці штодзённага нашэння. Таму я лічу, што нарадзілася прамысловым дызайнерам. Добра памятаю сваю першую калекцыю, зробленую з незвычайных матэрыялаў. Гэта былі шнуры, з якіх я ўручную саткала тканіну. Гэта быў мой дастаткова ўдалы дэбют. Тая калекцыя была вывезена на мяжу і паказана на вялікім подыуме ў Берліне.

***— Людміла Лабкова стварае адзенне для сябе?***

— Канешне, у асноўным я нашу сваё. На сабе апрабоўваю і толькі потым запускаю ў вытворчасць. Адначасова я люблю і вырабы сваіх калег. Я з імі сябрую, мне падабаецца тое, што яны ствараюць. Таму часам люблю прыкупіць рэч з подыумнай калекцыі сваіх сябровак. Бывае і так, што зраблю нейкую эксклюзіўную спадніцу, а потым заскочу ў любы мас-маркет, каб прыкупіць да яе звычайную майку.

***— Аксесуары вы таксама ствараеце самастойна?***

— Я ва ўсім спадзяюся на калег, якія спецыялізуюцца ў той ці іншай галіне. Я давяраю ім, яны — мне, і ў нас усё хутка і лёгка атрымліваецца.

**«Здаецца важным прыцягваць увагу грамадскасці да таго, што папулярызуе наша, адметнае, беларускае. Таму што наша праблема — нелюбоў да свайго».**

***— Як вы лічыце, сёння дызайнер адзення абавязкова павінен ведаць тэхналогіі шыцця?***

— Я ведаю працэнтаў 90 дызайнераў, якія не ўмеюць шыць. Цяпер гэта не модна. Пры гэтым я са старой школы дызайнераў. Каб стварыць калекцыю, патрэбна іскра, ідэя, натхненне і... жаданне працаваць. Аднаго творчага парыву недастаткова. Няўменне шыць можа стаць нават плюсам. Магчыма, вы знойдзеце зусім іншую тэхналогію стварэння адзення, якой увогуле не было дагэтуль. Сёння шыццё адзення — адна з самых састарэлых формаў стварэння адзення. Цяпер адзенне можна клеіць, паяць, зварваць... Тэхналогіі развіваюцца, і гэта цікава. Аднойчы я бачыла калекцыю аксесуараў, створаную 12-гадовай дзяўчынкай з дапамогай 3D-ручкі. На мой погляд, гэта была вельмі тэхналагічная, перспектыўная і цікавая работа. Менавіта таму важна шукаць нешта сваё.

***— Чаго не хапае нашай беларускай модзе?***

— У нас не сфарміравана індустрыя моды. Яна фарміруецца з маркетынгу, сістэмы продажаў і супрацоўніцтва з прэсай. Апошняе — гэта тры чвэрці поспеху. Бо толькі прэса даносіць да публікі, што будзе модна налета. Гэта такі масток ад творчасці дызайнера, індустрыі вытворчасці да канчатковага спажыўца. На жаль, у нас няма журналістаў, якія спецыялізуюцца на тэме моды. Журналістыка моды — гэта асобны кірунак. Гэтак жа, як і менеджмент моды. Цяпер я раблю ў гэтым кірунку тое, што магу: запрашаю да сябе студэнтаў на стажыроўку, каб працаваць над нацыянальнымі праектамі. Каб маладых уцягваць у гэтую справу і паказваць, як гэта можа быць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



Калекцыя «Райская птушка».

# ПРАЧЫСТАЯ ПРЫНЯСЕ ХЛЕБА ЧЫСТАГА



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Хват, бойкі, удалы чалавек (разм.). **2.** Адна з назваў Трэцяга Спаса, які адзначалі 29 жніўня. **7.** Добры Трэці Спас — узімку будзе ... (прык.). **9.** Галоднаму хлеб наўме, а сытаму — ... (прык.). **10.** «О, ... ! Хлебапашцы! // За вашу працу — вам паклон!». З верша Т. Дзям'янавай «Хлеб». **11.** «На вуліцы суха ..., // Пайду замуж за Піліпа». З прыпеўкі. **13.** Горкая часам ..., ды хлеб ад яе салодкі (прык.). **14.** Магутная жывёліна. **18.** Жаночая прычоска. **19.** Прыгажосць. **20.** Невершаваная літаратура. **21.** Месца для ляжання. **23.** Тое, што і ікол. **24.** Месца каля вёскі, дзе пасецца жывёла. **26.** Цвёрдыя духмяныя плады паўднёвага дрэва. **30.** Вялікае хлебаробчае свята, якое адзначалі 28 жніўня («... прынясе хлеба чыстага») (прык.). **32.** Умоўная велічыня, адносна якой вызначаецца тэмпература чаго-небудзь. **33.** Кветка, краска (паэт.). **34.** Пачынальнік, зачыншчык чаго-небудзь. **35.** Рэчыва, якое выклікае браджэнне, закісанне.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Чыя ..., таго і хлеб (прык.). **3.** Індывідуум. **4.** Засеянае поле. **5.** Спіс з пералічэннем чаго-небудзь. **6.** ... рукам, што пахнуць збожжам (прык.). **8.** ..., або лаянка; яна не дазвалялася ў хаце, калі выпякалі хлеб. **12.** Калі журавель адляціць да Трэцяга Спаса, то на ... (14 кастрычніка) будзе марозна (прыкм.). **15.** ... на арэхі — ... хлеба на наступны год (прыкм.). **16.** Трэці Спас — бяры рукавіцы ў ... (прык.). **17.** ... вучыць, а жыццё выхоўвае (прык.). **20.** «І хлебу нізкі, да зямлі, // Аддаў ..., як брату». З верша М. Танка «Прытча пра хлеб». **22.** Гульня з драўлянымі шарамі. **25.** У каго чорна ..., у таго і хлеба скіба (прык.). **27.** Вузкая палоска зямлі, ускапаная на агародзе. **28.** Гнаёк ды лубінок — хлеба і на другі ... (прык.). **29.** Насякомае-паразіт; некалі на Трэці Спас, да ўзыходу сонца, праводзілі абрад іх выгнання з хаты, пры гэтым прыгаворвалі: «Прыйшоў Спас, штоб не было ... у нас». **31.** Сей жыта ў прысак, ... у гразь, то будзеш князь (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 1. Зух. 2. Спажынкі. 7. Квас. 9. Рай. 10. Хлебаробы. 11. Ліпа. 13. Праца. 14. Зубр. 18. Кукла. 19. Краса. 20. Проза. 21. Ляжак. 23. Клык. 24. Выган. 26. Айва. 30. Прачыстая. 32. Нуль. 33. Квет. 34. Запявала. 35. Закваска.
**Па вертыкалі:** 1. Зямля. 3. Асоба. 4. Ніва. 5. Пералік. 6. Хвала. 8. Сварка. 12. Пакровы. 15. Ураджай. 16. Запас. 17. Школа. 20. Паклон. 22. Кракет. 25. Глыба. 27. Града. 28. Гадок. 29. Клоп. 31. Авёс.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.05 | 20.17 | 14.12 |
| Віцебск — | 5.52 | 20.10 | 14.18 |
| Магілёў — | 5.55 | 20.07 | 14.12 |
| Гомель — | 5.55 | 20.00 | 14.05 |
| Гродна — | 6.21 | 20.31 | 14.10 |
| Брэст — | 6.25 | 20.28 | 14.03 |

### Месяц

*Першая квадра 18 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Аляксея, Антона, Аркадзя, Вячаслава, Дзмітрыя, Івана, Пятра, Сяргея, Якава, Яфіма.*
***К.** Луізы, Рыгора, Юзафа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 25 ЖНІЎНЯ

У краіне

**1938** год — нарадзіўся Генадзь Іосіфавіч Гануш (в. Гута Уздзенскага раёна), беларускі вучоны ў галіне эканомікі, доктар эканамічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Аўтар больш як 200 навуковых прац у галіне эканомікі і арганізацыі аграродніцтва, фарміравання рынку міжгаспадарчай кааперацыі, інтэграцыі і кіравання. Пад яго кіраўніцтвам распрацавана і ўкаранёна ў практыку канцэпцыя развіцця аграродніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама арганізацыйна-эканамічны механізм эфектыўнага функцыянавання ўсяго садавіна-агароднінага падкомплексу.

**1953** год — нарадзіўся (г. Полацк) Уладзімір Арлоў, беларускі пісьменнік. Працаваў настаўнікам гісторыі ў Наваполацку, карэспандэнтам, намеснікам рэдактара гарадской газеты «Хімік», рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». У творах распрацоўвае гістарычную тэматыку. Аўтар 20 кніг прозы, паэзіі, гістарычных нарысаў і эсэ. Творы У. Арлова перакладаліся на 25 моў, у т. л. на нямецкую, англійскую, польскую, чэшскую, французскую, эстонскую, літоўскую, славацкую, грузінскую і інш. Аўтар сцэнарыяў навукова-дакументальных фільмаў «Ефрасіння Полацкая», «Полацкія лабірынты», «Сімяон Полацкі» і інш.

У свеце

**325** год — закончыўся Першы Усяленскі сабор у Нікеі. Ён быў скліканы візантыйскім імператарам Канстанцінам Вялікім для таго, каб паставіць кропку ў спрэчцы паміж епіскапам Аляксандрам і Арыем. Аляксандр абвінавачваў Арыя ў блюзнерстве, паколькі той адмаўляў боскасць Хрыста. Ён сцвярджаў, што Хрыстос не Бог, а першая і найдасканалейшая істота са створаных Богам. На саборы прысутнічала многа епіскапаў, пасля праслаўленых царквой у ліку святых (у прыватнасці, Мікалай, епіскап Мір Лікійскіх і святціцель Спірыдон Трыміфунцкі). На працягу некалькіх дзён сабор не мог лагічна даказаць неправату Арыя. Згодна з паданнем, доказам хрысціянскага ўяўлення пра Бога як пра непадзельную Святую Тройцу з'явіўся цуд, створаны свяціцелем Спірыдонам. Ён узяў у рукі гліняны чарапок і сказаў: «Бог, як і гэты гліняны чарапок, ёсць Бог Айцец, Бог Сын і Бог Дух Святы». Разам з гэтымі словамі з чарапка вырваліся языкі полымя, затым палілася вада і, нарэшце, утварылася гліна. Пасля гэтага сабор адхіліў арыянскае веравучэнне і зацвердзіў Сімвал Веры для ўсіх хрысціян імперыі. Акрамя зацвярджэння Сімвала Веры на саборы таксама былі прынятыя правілы для вылічэння свята Вялікадня ў хрысціян.

**1918** год — нарадзіўся Леанард Бернстайн, амерыканскі дырыжор, кампазітар, піяніст, адзін з найбуйнейшых дырыжораў XX стагоддзя. Аўтар балетаў, сімфоній, мюзіклаў («Вестсайдская гісторыя»), музыкі да фільмаў. Памёр у 1990 годзе.

**1938** год — нарадзіўся Фрэдэрык Фарсайт, англійскі пісьменнік, аўтар трылераў «Дасье Адэса», «Псы вайны», «Пастыр» і інш.



**1943** год — пачалася бітва за Днепр — наступальная аперацыя савецкіх войскаў супраць фашысцкіх захопнікаў.

## УСМІХНЕМСЯ

**Першае правіла байцоўскага клуба: «Мама, ён першы пачаў!»**

Як адказваць на няздручныя пытанні:
— Ну, пачнём з таго, што на гэтым і скончым.

**Як кажа адна мая знаёмая хатняя гаспадыня:**
**«У любой незразумелай сітуацыі ідзі гатаваць. Што б ні здарылася, усё адно пасля гэтага ўсе захочуць есці».**

— Дарагая, я думаю, што ў сям'і трэба ўсё рашаць разам.
— Гэта правільна.
— Таму ідзі сюды, і будзем разам рашаць нашаму Дзімку задачу па матэматыцы.

**Турыстам прапануюць пажыць у «пяцізоркавай» палатцы: у ёй ёсць пяць дзірак для зорак.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2994.
Нумар падпісаны ў 19.30 24 жніўня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12